Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 271 (6548) | 24 лістапада 1939 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

БИБЛИОТЕКА имени В. И. ЛЕНИНА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

15-ГОДДЗЕ ТУРКМЕНСКАЙ ССР. Прывітанне Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). Прывітанне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Прывітанне Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР. Юбілейная Сесія Вярхоўнага Совета Туркменскай ССР.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ. Даверяныя асобы прыступілі да работы. М. Астапенка — Задачы даверяных асоб. Б. Эйдзінаў — Партарганізацыя аказвае дапамогу. Д. Я. Кузняцоў — Разгортваю палітычную агітацыю. І. Кастрынскі — Трымаю цесную сувязь з выбаршчыкамі.

Па-большэвіцку разгарнуць агітацыю за кандыдатаў.

Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

П. Турскі — Баявыя пасланцы партыі Леніна—Сталіна.

З. Мяцеліца — Дзень у партыйным кабінеце.

АРТЫКУЛЫ:

А. Худайбергенаў — 15-годдзе Туркменскай ССР.

У. Амлінскі — Геніяльны твор Ч. Дарвіна.

М. Юдзлевіч — Дапамагчы развіццю мастацтва заходніх абласцей БССР.

С. Казначэеў — Арганізаваць атратохвучобу калгаснікаў.

ЗА РУБЯЖОМ:

Разгул антысавецкай кампаніі ў Фінляндыі.

Арышт віноўніка замаху ў Мюнхене.

Заява прэм'ер-міністра Японіі Абэ.

Вайна ў Еўропе. Дзеянні авіяцыі.

24 СНЕЖНЯ — УСЕНАРОДНАЕ ВЯЛІКАЕ СВЯТА

24 снежня 1939 года. Роўна месяц адзяляе нас ад гэтага знамянальнага дня. 24 снежня — дзень усенароднага свята, свята ўсіх працоўных нашай социялістычнай радзімы. Да гэтага дня, як да вялікага таржаства, рыхтуецца ўвесь наш многамільённы совецкі народ. 24 снежня мільёны выбаршчыкаў прыдуць да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, каб прадэманстрыраваць несакрушымае маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, згуртаванага вакол сваёй вялікай комуністычнай партыі, вакол свайго роднага правадыра таварыша Сталіна.

Працоўныя Совецкай Беларусі, як і ўсяго вялікага Совецкага Саюза, адзначаюць набліжэнне дня выбараў новым уздымам у палітычным жыцці і на вытворчасці, новымі поспехамі, новымі падарункамі маперы-радзіме.

Кожны дзень, кожная гадзіна прыносяць усё новыя і новыя поспехі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва. Вытворчы ўздым шырыцца на ўсіх прадпрыемствах, на ўсіх калгасах нашай краіны. Мінскія чыгуначнікі дні падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных азнамяноўваюць новымі вытворчымі перамогамі. Упераз ідуць стаханаўцы. Яны сістэматычна ў 2—3 і больш разоў перавыконваюць нормы. Малады токар-комсамолец тав. Кудрэвіч, спаборнічаючы на лепшую сустрэчу дня выбараў, выконвае норму звыш чым на 400 процантаў. Токар-стаханавец тав. Харэвіч дае больш 2-х з палавінай норм. Вялікі творчы ўздым перажываюць рабочыя Беларускай чыгункі: імі выканан план пагрузкі і выгрузкі.

Новымі вытворчымі перамогамі адзначаюць выбарчую кампанію рабочыя г. Гомеля. Калектыў Гомельскай трыкатажнай фабрыкі «8 сакавіка» да тэрміну выканаў 11-месячную праграму, даўшы прадукцыі звыш чым на 9 мільёнаў рублёў.

Творчая ініцыятыва мас штодзённа раскрывае новыя магчымасці, новыя магутныя рэзервы для далейшага павелічэння прадукцыйнасці працы. Пераход на многастаночную работу — адно з яркіх праяўленняў глыбокага совецкага патрыятызма і любві совецкага народа да сваёй маперы-радзімы. Распе колькасць прадпрыемстваў, якія ўнядраюць новую форму стаханаўскага руху — многастаночнае абслугоўванне. Мінская швейная фабрыка «Кастрычнік», дзякуючы пераходу на многастаночнае абслугоўванне, за дзве дэкады лістапада дала звыш плана прадукцыі на 722.500 рублёў. На фабрыцы зараз няма ні аднаго адстаючага цэха. Усе цэхі перавыконваюць план. На прадпрыемстве налічваецца 1146 стаханаўцаў. Працоўныя масы ўсё вышэй узнімаюць спяг социялістычнага спаборніцтва імені Трэцяй сталінскай пяцігодкі. У славу сваёй вялікай радзімы-маперы совецкія людзі творяць цудоўныя справы. Рабочыя калектывы прадпрыемстваў Наркаммясцпрома і Наркамлегпрома БССР дабіліся новай перамогі — датэрмінова выканалі 11-месячную вытворчую праграму; прадпрыемствы Наркаммясцпрома за 10 месяцаў і 20 дзён лістапада выпусцілі прадукцыі на 114 мільёнаў 640 тысяч 900 рублёў, што складае 102,6 проц. 11-месячнага задання; прадпрыемствы Наркамлегпрома выканалі 11-месячную праграму на 100.8 проц., даўшы прадукцыі на 291 мільён 868 тысяч рублёў.

Выканаць і перавыканаць гадавыя вытворчыя планы да 24 снежня — да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных — з'яўляецца зараз баявым лозунгам усіх прадпрыемстваў і калгасаў рэспублікі.

Наша совецкая інтэлігенцыя, нашы кампазітары, мастакі, пісьменнікі, артысты, рыхтуючыся да вялікага дня ў жыцці нашай радзімы — дня выбараў у мясцовыя советы, — з яшчэ большым творчым энтузіязмам і натхненнем працуюць над новымі яркімі творамі мастацтва і навукі, каб яшчэ больш уславіць і ўзвялічыць радзіму, каб унесці новыя каштоўныя ўклады ў скарбніцу социялістычнай культуры.

Прадстаячыя выбары ў мясцовыя органы ўлады, правадзімыя на аснове Сталінскай Канстытуцыі, будуць сапраўды дэмакратычнымі выбарамі. Яны яшчэ больш умацуюць сувязь мясцовых советаў з найшырэйшымі масамі насельніцтва.

Закончылася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Мінскага, Гомельскага, Віцебскага, Магілеўскага і Палескага абласных советаў. Пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх і раённых советаў. Дэпутаты советаў — слугі народа. Народ пасылае ў советы сваіх лепшых сыноў і дочак. Да кіравання дзяржавай прыйдуць дзесяткі тысяч новых людзей, выхаваных партыяй большэвікоў, людзей, даказаўшых сваю адданасць справе комунізма, сваю загартаванасць у барацьбе з ворагамі народа.

Наступае новы, найбольш адказны этап выбарчай кампаніі — агітацыя за кандыдатаў.

Агітацыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — пачотная і адказная справа. Яна павінна праводзіцца ў спалучэнні з выкананнем канкрэтных гаспадарча-палітычных задач мясцовых советаў. Даверяныя асобы і агітатары павінны па-баявому агітаваць за кандыдатаў сталінскага блока, памятаючы, што далейшае ўмацаванне гэтага блока — залог новых перамог комунізма.

Зараз ўсю арганізацыйную і агітацыйна-масавую работу трэба сканцэнтрыраваць на выбарчым участку. Сёння мы друкуем вопыт першых дзён работы даверяных асоб. Даверяны тав. Кастрынскі расказвае, што на выбарчым участку, дзе ён працуе, створан агіткалектыў з 30 чалавек, з агітатарамі праведзены 2 нарады па пытанню плана работы і абмену вопытам. Партыйная арганізацыя мінскага завода імені Молатава (сакратар тав. Фідлер), якая з'яўляецца галаўной на выбарчым участку, дзе працуе даверяным тав. Кастрынскі, штодзённа дае канкрэтныя ўказанні, як лепш арганізаваць работу на выбарчым участку.

Станоўчыя рэзультаты работы адзначае тав. Гершэнзон — даверяны на выбарчым участку № 1 Варашылаўскага раёна гор. Мінска. На гэтым участку масава-палітычныя мерапрыемствы цесна спалучаюцца з арганізацыйнай работай. Агітатары сістэматычна праводзяць гутаркі ў гуртках і дапамагаюць ператварыць участак у цэнтр палітычнай агітацыі.

Неабходна шырэй скарыстаць багацейшы вопыт агітацыйнай работы, накоплены партарганізацыямі ў мінулыя выбары. У тыя дні агітацыя за кандыдатаў цесна спалучалася з выкананнем вытворчых планаў прадпрыемстваў. Поспех у рабоце быў забяспечан тым, што шырока прымяняліся ўсе формы і металы агітацыйна-масавай работы. Гутаркі, сходы хатніх гаспадынь, палітдні, пасылка агітбрыгад, агітмашын, экскурсіі у музеі, паходы ў кіно і іншыя формы работы—усё было шырока скарыстана для поспеху выбараў. Вялікай папулярнасцю карысталася наглядная агітацыя: фотавыстаўкі, фотавітрыны. На выбарчых участках агітатары былі прымацаваны да поўнай колькасці дамоў, кватэр, і сістэматычна вялі агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў. Шырокі размах і прымяненне рознастайных форм масавай работы забяспечылі поўны ахват палітычнай агітацыяй усіх выбаршчыкаў гаралоў і вёсак. Усё гэта трэба зараз ўлічыць.

З вялікім уздымам і натхненнем пад спягам Леніна—Сталіна ідуць працоўныя насустрач выбарам. Дзень выбараў—24 снежня 1939 года—увойдзе ў гісторыю з'яднанага беларускага народа, як велізарнае таржаство сапраўднага социялістычнага дэмакратызма, як новае таржаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Няма сумнення, што гэты дзень будзе азнаменаван у БССР як і ва ўсіх брацкіх рэспубліках вялікага Совецкага Саюза, новым бліскучым трыумфам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ТУРКМЕНСКАЙ ССР СОУНАРКОМУ ТУРКМЕНСКАЙ ССР ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) ТУРКМЕНІСТАНА

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) вітаюць рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыю Туркменскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі з пятнаццацігоддзем утварэння Туркменскай ССР.

Туркменскі народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі з былой прыгнечанай, адсталай калоніі царызма, якая бязлітасна эксплаатавалася баямі, ханамі, эмірамі і царскімі чыноўнікамі, стварыў социялістычную рэспубліку. За пятнаццаць год, прайшоўшых з моманту ўтварэння рэспублікі, рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя Совецкага Туркменістана, пры брацкай дапамозе ўсяго совецкага народа, дабіліся вялікіх поспехаў ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва.

За кароткі тэрмін нанава створан рад галін прамысловасці, пабудаваны буйнейшы механічны шклозавод, хімічны камбінат Кара Богаз-Гол, нафтавыя промыслы, серны завод у Каракумах і інш.

Сельская гаспадарка рэспублікі вырасла і ператварылася ў сучасную буйную калгасную механізаваную гаспадарку. Перабудавана ірыгацыйная сістэма. Калгаснікі Туркменістана дабіліся высокіх ураджаяў бавоўны, амаль у два разы павялічыўшы ўраджайнасць за апошнія пяць год.

У краіне, дзе да Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі было 0,7 процанта пісьменных, пышна расквітнела совецкая нацыянальная туркменская культура, растуць нацыянальныя кадры новай, народнай інтэлігенцыі, а пісьменнасць узнялася да 80 процантаў.

Гэтых поспехаў рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя Совецкага Туркменістана дабіліся, разграміўшы, пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, варожыя гнёзды буржуазных нацыяналістаў і трацкісцка-бухарынскіх агентаў імперыялізма, якія прабавалі зноў увергнуць свабодны туркменскі народ у кабалу баеў, ханаў і капіталістаў.

Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) выражаюць цвёрдую ўпэўненасць, што туркменскі народ, у брацкім садружестве з усімі народамі Совецкага Саюза, будзе і надалей, не пакладаючы рук, па-большэвіцку мацаваць магутнасць Туркменскай ССР і ўсяго Совецкага Саюза.

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(большэвікоў)

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ТУРКМЕНСКАЙ ССР

Бабаеву Хівалі

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР вітае рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю і ўсіх працоўных Совецкай Туркменіі з днём слаўнай гадавіны — пятнаццацігоддзем стварэння Туркменскай ССР.

Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя, якая знішчыла панаванне памешчыкаў і капіталістаў, назаўсёды вызваліла туркменскі народ ад ланцугоў рабства і нацыянальнага прыгнечання.

На аснове няўхільнага правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе са адраднікамі радзімы—трацкісцка-бухарынскімі і буржуазна-нацыяналістычнымі элементамі, туркменскі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры брацкай дапамозе саюзных рэспублік дабіўся рашаючых поспехаў ва ўсіх галінах палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Створаны буйныя прамысловыя прадпрыемствы, механізавана калгасная сельская гаспадарка, няўхільна расце матэрыяльны добрабыт працоўных, усё вышэй узнімаецца іх культурны ўзровень.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выражае поўную ўпэўненасць, што працоўныя Туркменіі пад спягам Сталінскай Канстытуцыі ў брацкім садружестве з усімі народамі СССР пойдуць да новых далейшых перамог комунізма.

М. КАЛІНІН.
А. ГОРКІН.

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ТУРКМЕНСКАЙ ССР

гор. Ашхабад.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР ад імені рабочых, сялян і інтэлігенцыі Расійскай Совецкай Федэратыўнай Социялістычнай Рэспублікі горача вітае шчаслівы брацкі туркменскі народ у дзень пятнаццацігоддзя Туркменскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі.

На аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі (большэвікоў), працоўныя Совецкага Туркменістана за прайшоўшыя 15 год з дня ўтварэння Туркменскай ССР дасягнулі велізарных поспехаў у галіне развіцця социялістычнай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры. Пабудаваны новыя фабрыкі, заводы, клубы, тэатры, навучальныя ўстановы. Социялістычная сельская гаспадарка Туркменістана дае высокія ўраджаі бавоўны і іншых сельскагаспадарчых культур. Усё вышэй узнімаецца матэрыяльны і культурны ўзровень туркменскага народа, няўхільна расце яго добрабыт.

Гэтых поспехаў працоўныя Туркменістана дасягнулі ў рэзультаце разгрому буржуазных нацыяналістаў і трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, якія імкнуліся да аднаўлення капіталістычнага рабства.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР выражае цвёрдую ўпэўненасць, што туркменскі народ і надалей нястомна будзе працаваць пад далейшым умацаваннем Туркменскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі і ўсяго Совецкага Саюза і пад спягам Сталінскай Канстытуцыі, разам з усімі народамі СССР, пойдзе да поўнай перамогі комунізма.

Няхай жыве туркменскі народ!

Няхай жывуць народы Совецкага Саюза!

Няхай жыве правадыр і настаўнік працоўных — вялікі Сталін!

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР А. БАДАЕЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР Г. КАЗЛОЎ.

Юбілейная Сесія Вярхоўнага Совета Туркменскай ССР

АШХАБАД, 23 лістапада. (ТАСС). Сёння ў тэатры імені Пушкіна ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылася юбілейная Сесія Вярхоўнага Совета Туркменскай ССР. Разам з дэпутатамі Вярхоўнага Совета Туркменскай ССР у зале прысутнічаюць каля 300 гасцей з розных гаралоў і раёнаў Рэспублікі. На Сесію прыбылі дэлегацыі брацкіх рэспублік — Узбекістана, Таджыкістана, Кіргізіі, Азербайджана, Башкірыі, Кара-Калпакіі.

Адкрываючы пасяджэнне юбілейнай Сесіі старшыня Вярхоўнага Совета Туркменіі тав. Бердыеў выступіў з кароткай прамовай.

З велізарным натхненнем пад бурныя апладысменты Сесія прыняла прывітанне таварышу Сталіну.

З вялікім змястоўным дакладам аб 15-годдзі Туркменскай ССР выступіў Старшыня Соўнаркома Туркменіі тав. Худайбергенаў.

Аглашаецца прывітанне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Сесія выслухоўвае яго з велізарнай увагай.

З прывітаннем выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Узбекскай ССР тав. Ахунбабаеў.

З вялікім уздымам Сесія прыняла прывітанне таварышам Молатаву, Калініну, Варашылаву і Андрэеву.

НАРКАМАТЫ МЯСЦОВАЙ І ЛЕГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР ПЕРАВЫКАНАЛІ 11-МЕСЯЧНУЮ ПРАГРАМУ

Калектывы прадпрыемстваў Наркаммясцпрома і Наркамлегпрома БССР, спаборнічаючы з калектывамі прадпрыемстваў адпаведных наркаматаў брацкай УССР, дабіліся новай перамогі: датэрмінова выканана і перавыканана 11-месячная вытворчая праграма.

Прадпрыемствы Наркаммясцпрома за 10 месяцаў і 20 дзён лістапада выпусцілі прадукцыі на 114.640.900 рублёў, што складае 102,6 процанта 11-месячнага задання. Значна перавыканалі праграму прадпрыемствы трэстаў Поліграфпрамысловасці (108 проц.), хімічнага (105 проц.) і машынабудаўнічага (103.3 проц.). 8 прадпрыемстваў датэрмінова закончылі выкананне гадавой праграмы. Сярод іх — машынабудаўнічыя заводы «Комінтэрн» (Віцебск), «Пролетарскі молат» (Барысаў), «Чырвоны барэц» (Бабруйск), завод «Краснапвет» (Лоеў) і інш.

Прадпрыемствы Наркамлегпрома выканалі 11-месячную праграму на 100.8 проц., даўшы прадукцыі на 291.368 тысяч рублёў. Фабрыкі Белшвейтрэста выпусцілі за гэты час звыш плана на 1.626 тысяч рублёў швейных вырабаў.

(БЕЛТА).

ВЫДАТНАЯ ПЕРАМОГА

ГОМЕЛЬ, 23 лістапада. (Па тэлефону). Знамянальны дзень выбараў у мясцовыя советы чыгуначнікі Беларускай чыгункі імкнуцца азнаменаваць новымі вытворчымі перамогамі. Днямі калектыў чыгункі атрымаў выдатную перамогу, датэрмінова выканаўшы план пагрузкі і выгрузкі. На 22 лістапада звыш плана пагружана 10.000 вагонаў і выгружана 73.678 вагонаў.

На чыгунцы шырыцца сопыялістычнае спаборніцтва за тое, каб да 24 снежня пагрузіць звыш плана каля 60 тысяч вагонаў. Паравознікі дабіліся датэрміновага сканчэння плана пад'ёмачнага рамонту паравозаў. Звыш плана ўжо адрамантаван 21 паравоз.

Р. СЫРКІН.

ХРОНІКА

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. Жэмчужына П. С. вызвалена ад абавязкаў наркома рыбнай прамысловасці СССР у сувязі з пераходам на іншую работу.

(ТАСС).

Перадвыбарчы сход на фабрыцы імені Крупскай

СТАРШЫНЯ СНК БССР тав. К. Б. КІСЯЛЁЎ—КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ МІНСКАГА ГОРСОВЕТА

23 лістапада на мінскай фабрыцы імені Крупскай з выключным узымам прайшоў сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых.

У парадку дня — вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскога і раённага совета і выбары даверяных асоб.

З прапановаю аб вылучэнні кандыдатаў у гаралскі совет выступае тэхнічны дырэктар фабрыкі тав. Сарокін.

— 24 снежня, — гаворыць ён, — увесь совецкі народ пад спягам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных пойдзе да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дочак краіны. У мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных мы павінны вылучыць такіх людзей, якія апраўдаюць высокае званне дэпутата совета і будуць няўхільна выконваць наш наказ. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета старшыню Совета Народных Камісараў БССР тав. Кісялёва Кузьму Бенедыктавіча.

Удзельнікі схода горача падтрымалі прапанову тав. Сарокіна.

Аналушна вылучаецца кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога совета тав. Карасік Фёдар Андрэевіч, рабочы, член ВКП(б), старшыня фабкома фабрыкі імені Крупскай.

Вылучаюцца таксама кандыдатамі ў дэпутаты Мінскага гарадскога совета — работніца Лабатая Надзежда Цярэнцьеўна, беспартыйная; работніца Данільчык Анна Сяргееўна, беспартыйная; работніца Бірукова Еўдакія Давідаўна, беспартыйная, майстар ленты.

Кандыдатамі ў дэпутаты Сталінскага раённага совета сход аднадушна вылучае работніцу Зелікман Маню Майсееўну, члена ВКП(б), якая вылучана на работу ў Сталінскі РК ЛКСМБ заг. аргаддзелам; начальніка цэха тав. Плаўніка Абрама-Лейзера Евелевіча, члена ВКП(б); стаханаўку тав. Тараканаву Еўгенію Аляксандраўну, члена ЛКСМБ; работніцу Парашчэнка Анну Наумаўну, кандыдата ВКП(б) і тав. Лагуту Марыю Пятроўну, члена ЛКСМБ.

Кандыдат у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 9-й выбарчай акрузе, член Ваеннага совета Беларускай Асобай Ваеннай Акругі Іван Захаравіч Сусайкоў. Фото Б. Вернера. (Фотахроніка БЕЛТА).

Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі

У ЧЭСЦЬ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

ГОМЕЛЬ, 23 лістапада. (Кар. «Звязды»). Радасныя дні перажываюць працоўныя Гомеля. Усюды на прадпрыемствах праходзяць сходы, на якіх рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі бяруць на сябе абавязацельствы па дастойнай сустрэчы знамянальнай даты.

Калектыў крупазавода № 7 адзначыў дзень вылучэння кандыдатаў у дэпутаты горсовета датэрміновым выкананнем гадавога плана. На 21 лістапада завод выпусціў звыш плана 280 тон круп.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі Нова-Беліцкага тлушчкамбіната яшчэ да Кастрычніцкіх свят закончылі гадавую праграму. Яны абавязаліся к канцу года даць звыш плана на 7.000 рублёў прадукцыі. І гэта абавязацельства з чэсцю выконваецца.

Мартарынавы завод (начальнік тав. Гладкоў) штодзённа заданне выконвае на 115 проц.

Пасяхова працуе таксама мылаварны завод гэтага камбіната.

17 лістапада калектыў трыкатажнай фабрыкі «8-е сакавіка» закончыў 11-месячную праграму, выпусціўшы прадукцыі на 9.301 тысячу рублёў.

У сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных калектыў фабрыкі абавязаўся закончыць гадавую праграму к 10 снежня, замест узятага абавязацельства — да 12 снежня, і даць звыш плана на 650 тысяч рублёў прадукцыі.

Стаханаўка трыкатажнага цэха тав. Зайцава, якая перайшла працаваць на 6 станкоў, выконвае заданне на 122 процанты; тав. Кісляякова — на 103 проц., работніца Касцюк замест 14 машын абслугоўвае зараз 21 і сваю норму выконвае на 117 процантаў.

На Нова-Беліцкім лесакамбінаце пачалі ўкараняць метад сумяшчэння прафесій. Стаханавец-слесар мэблевай фабрыкі камбіната тав. Краўчанка сумяшчае і работу шэрпіка. Табельшчык гэтай фабрыкі тав. Двоскін адначасова працуе і брыгадзірам. Настройшчык болтарэзнага станка тав. Халановіч адначасова сумяшчае работу станочніка на болтарэзцы.

Вытворчыя перамогі завода „Ударнік“

У сувязі з выбарчай кампаніяй з кожным днём расце палітычны і вытворчы ўздым сярод рабочых і служачых мінскага завода «Ударнік».

Завод з месяца ў месяц выконвае і перавыконвае сваю вытворчую праграму. У адказ на заклік краснапролетарцаў калектыў завода ўзяў абавязацельства выканаць гадавую праграму к 5 снежня — дню Сталінскай Канстытуцыі. За кастрычнік месяц завод выканаў план на 111 проц.

Асобныя цэхі завода ўжо к 1 лістапада выканалі свае планы. Так, цэх сталовых 20- і 5-кілаграмавых вагаў «Беранжэ» выканаў свой гадовы план к 1 лістапада. Лепшы стаханавец гэтага цэха слесар тав. Блонскі, які працуе па вырабу рычажкоў да сталовых вагаў, сістэматычна выконвае сваю дзённую норму на 220—230 проц.

Добрыя ўзоры стаханаўскай работы паказвае слесар гэтага цэха тав. Дзем'яновіч, ён выконвае план больш чым на 200 проц. Профорг гэтага цэха тав. Аронін сістэматычна выконвае план на 200 — 250 проц. Калектыў цэха сталовых вагаў узяў абавязацельства даць звыш гадавога плана к 5 снежня 1.000 сталовых вагаў.

Брыгада цэха № 2 па зборцы амбарных замкоў таксама выканала гадавы вытворчы план к 1 лістапада. План за кастрычнік месяц гэта брыгада выканала на 137,6 проц. Лепшыя стаханаўцы яе тт. Рыбалтоўскі, Ансілеўскі, Крыштафовіч, Шалапаў і іншыя выконваюць нормы на 200—300 проц. Усе яны прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці завода.

З чэсцю выконвае ўзятыя на сябе социялістычныя абавязацельствы комсамольска-маладзёжная брыгада штампоўшчыкаў, арганізаваная ў дні падрыхтоўкі да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Так, стаханавец гэтай брыгады тав. Пахомзін, які працуе на самым магутным (180-тонным) прэсе, выконвае дзённую норму на 180—200 процантаў. Маладыя стаханаўцы тт. Катнікі, Сухоцкі, Паўлоўскі, Мезін выконваюць нормы на 140—160 проц.

Усе стаханаўцы завода гараць жаданнем прыйсці да дня выбараў з яшчэ большымі вытворчымі поспехамі.

А. БАГАЧОНАК.

Дастойны адказ на заклік ленінградскіх суднабудаўнікоў

ВІЦЕБСК, 23 лістапада. (Кар. «Звязды»). Заклік маладых суднабудаўнікоў Ленінградскага завода імені Орджанікідзе аб уключэнні ў социялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу знамянальнай даты — дня выбараў у Советы дэпутатаў працоўных, знайшоў гарачае адабрэнне рабочых прадпрыемстваў і чыгуначнага транспарта.

Першым на заклік ленінградскіх суднабудаўнікоў адклікнуўся калектыў чулочна-трыкатажнай фабрыкі імені Клары Цэткін. Зварот маладых рабочых абмеркаван у цэхах і змонах. Рабочыя, работніцы і інжынерна-тэхнічны персанал фабрыкі абавязаліся датэрмінова выканаць план 1939 года к 12 снежня — к дню знамянальнай гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет СССР, і да канца года даць звыш плана 23.000 кілограмаў трыкатажнага палатна і 350.000 пар наскоў, усяго на суму 800.000 рублёў. Рабочыя абавязаліся зэканоміць электраэнергіі на 5 проц., давесці лік многастаночнікаў і рабочых, якія сумяшчаюць аперацыі, да 120 чалавек; падрыхтаваць і выпусціць новых 80 значкістаў ВС і ПХА; паслаць у падшэфныя калгасы на выбарчыя ўчасткі 32 маладых агітатараў.

З. ЛАРЫСАЎ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ

ДАВЕРАНЫЯ АСОБЫ ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ

★ ★ ★

Партарганізацыя аказвае дапамогу

Перадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных Куйбышэўскай выбарчай акругі вылучыла мяне даверанай асобай па першаму выбарчаму ўчастку Куйбышэўскай акругі Кагановіцкага раёна горада Мінска.

Я добра разумею тую сур'ёзную адказнасць, якая ўскладзена на даверанную асобу. Народ аказаў мне вялікае давер'е, паставіў пачотную задачу — простымі, зразумелымі словамі бальшэвіцкай праўды агітаваць сярод выбаршчыкаў за вылучаных кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

З першых-жа дзён я ўзяўся за арганізацыю агітпункта і складанне плана сваёй далейшай работы на выбарчым участку.

Агітпункт мы арганізавалі ў 46-й Сталінскай школе. У гэтым-жа памяшканні знаходзіцца і выбарчы ўчастак. Утульны, невялічкі пакойчык упрыгожан партрэтамі правадыроў партыі і ўрада, плакатамі, лозунгамі, мастацкімі карцінамі. На агітпункце ёсць фото-газета і вітрына выбарчай літаратуры.

Адразу-ж пасля арганізацыі агітпункта на выбарчым участку былі наладжаны штодзенныя дзяжурствы агітатараў, якія даюць вычарпальныя адказы выбаршчыкам на ўсе цікавячыя іх пытанні. Дзяжурствы ўстаноўлены з 12 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.

20 лістапада на агітпункце былі праведзены першыя гутаркі з выбаршчыкамі. Агітатар тав. Абалікшта расказаў аб міжнародным становішчы, аб правакацыйных дзеяннях фінляндскіх правячых кругоў, накіраваных супроць СССР. У гэты-ж дзень я правёў гутарку аб надыходзячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Вопыт мінулых выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР паказаў, што поспех выбарчай кампаніі залежыць ад пастаноўкі агітацыйна-масавай работы. Таму я, пры дапамозе партыйнай арганізацыі, у першую чаргу ўзяўся за расстаноўку агітацыйных кадраў на выбарчым участку. Праверыў работу агітатараў тт. Куракевіча і Хазана, прысутнічаў у іх на занятках. Тав. Куракевіч умела праводзіць палітычную агітацыю. Ён на занятках скарыстоўвае геаграфічную карту, розныя дыяграмы. Гутаркі з выбаршчыкамі ў яго праходзяць жыва, захапляюча, на высокім палітычным узроўні. Хатнія гаспадыні задаволены сваім агітатарам.

Пры складанні плана мы зрабілі асноўны ўпор на правядзенне бальшэвіцкай агітацыі ў масах, на азнаямленне іх з выбарчым законам, са Сталінскай Канстытуцыяй, на арганізацыю сустрэч з кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў. У бліжэйшыя дні намечана правесці першую сустрэчу выбаршчыкаў з сваімі кандыдатамі.

У маёй дзейнасці, як даверанай асобы, ёсць яшчэ многа недахопаў. У прыватнасці, я не здолеў яшчэ закончыць праверку работы ўсіх агітатараў, не наладзіў учот мерапрыемстваў, якія праводзяцца на агітпункце. У бліжэйшы-ж час я пастараюся гэтыя недахопы ліквідаваць.

Уся мая работа на выбарчым участку праходзіць у цесным кантакце і пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі фабрыкі імені Куйбышэва.

Задачы, ускладзеныя на даверaных асоб, вельмі пачотныя і адказныя. Прыкладу ўсе намаганні, каб з чэсцю апраўдаць аказанае мне давер'е.

Б. М. ЭЙДЗІНАЎ.

★

ТРЫМАЮ ЦЕСНУЮ СУВЯЗЬ З ВЫБАРШЧЫКАМІ

Даверанай асобай я вылучан упершыню. Адчуваючы ўсю вялікую адказнасць даручанай мне справы, я з першых-жа дзён уключыўся ў актыўную работу. Спачатку мяне хвалявала такое пытанне: з чаго пачаць, якія функцыі ўваходзяць у маю работу? Разабрацца ў гэтым дапамагла мне партыйная арганізацыя мінскага завода імені Молатава, якая з'яўляецца галаўной на нашым 7-м выбарчым участку.

Добра зразумеўшы свае абавязкі, я выпрацаваў план работы. Ведаючы, што поспех выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных залежыць ад пастаноўкі палітычнай агітацыі, я ў першую чаргу праверыў, у якім становішчы знаходзіцца агітацыйна-масавая работа на выбарчым участку, а таксама і на прадпрыемстве. Выявіў, напрыклад, што на выбарчым участку не ўстаноўлены пэўныя дні для правядзення заняткаў. Кожны агітатар займаўся з хатнімі гаспадынямі, калі яму ўздумаецца. Былі выпадкі, калі асобныя агітатары пераносілі заняткі з аднаго дня на другі, а ў выніку зусім іх зрывалі. Гэта не давала магчымасці кантраліраваць работу агітатараў, паколькі ніхто добра не ведаў, у якія дні ў іх павінны адбывацца заняткі.

Зараз, разам з партбюро, мы ўстанавілі адзіныя дні заняткаў, што дае магчымасць пабываць на гутарках, падказаць агітатарам недахопы, падхапіць і памножыць добры вопыт.

На выбарчым участку створан агітканлектыў з 30 чалавек, з якімі перад кожнымі заняткамі рэгулярна праводзяцца кансультацыі. З агітатарамі праведзены ўжо дзве нарады па пытаннях плана работы і абмену вопытам. На адной нарадзе абмяркоўвалася пытанне аб пастаноўцы палітычнай агітацыі на выбарчым участку. Такія нарады будзем практыкаваць і ў далейшым. Устаноўлены на ўчастку дзяжурствы агітатараў, якія раз'ясняюць выбаршчыкам незразумелыя пытанні, праводзяць гутаркі на розныя тэмы.

Каб быць штодзённа ў курсе работы агітатараў, ведаць запросы выбаршчыкаў участка, мы да кожнага гуртка прымацавалі членаў выбарчых камісій.

Вялікім тормазам у рабоце агітатараў была адсутнасць неабходнай літаратуры. Не ўсе таварышы атрымлівалі журнал «Спутник агитатора» і «Блокнот агитатора». Гэты недахоп ліквідаван. Вылучан спецыяльны чалавек, які займаецца падборам неабходнай літаратуры да кожных заняткаў у гуртках.

Зараз мы прыступілі да разгортвання агітацыі за кандыдата ў дэпутаты Мінскага абласнога совета па Чкалаўскай акрузе. Разам з партбюро падрыхтоўваем агітвыезд, які мяркуем правесці 24 лістапада. У агітвыездзе прымуць удзел усе агітатары і члены ўчастковай выбарчай камісіі. Вызначаны тры пункты астаноўкі, дзе будуць праводзіцца мітынгі выбаршчыкаў.

Тром агітатарам, удзельнікам агітвыезда — тт. Фідлеру, Карасіку і Пінчуку даручана дэтальна азнаёміцца з біяграфіяй кандыдата. Падрыхтаваны і аформлены машыны, ёсць дагаворанасць з аркестрам. К гэтаму дню выпускаем дзве лістоўкі, тэкст іх ужо складзен. Выпусцім спецыяльны нумар шматтыражкі, прысвечаны выбарам. У газеце адлюструем работу асобных агітатараў, змесцім заметкі хатніх гаспадынь, у якіх яны раскажуць аб занятках у гуртках.

Актыўны ўдзел я прымаю ў афармленні выбарчага ўчастка. Арганізавана фото-вітрына па выбарчыя тэмы, падбіраецца неабходная літаратура. Штодзённа трымаю цесную сувязь з участковай выбарчай камісіяй, з нашымі агітатарамі.

Вялікую дапамогу мне аказвае партыйная арганізацыя. Сакратар партбюро тав. Фідлер заўсёды дае канкрэтныя ўказанні, як лепш правесці тое ці іншае мерапрыемства на выбарчым участку.

Вядома, зроблена мною яшчэ вельмі мала. Але гэта толькі пачатак работы. Прыкладу ўсе свае сілы, энергію і ўменне, каб апраўдаць аказанае мне партыяй Леніна—Сталіна высокае давер'е.

І. Г. КАСТРЫНСКІ.

СКАРЫСТОЎВАЮ ВОПЫТ МІНУЛЫХ ВЫБАРАЎ

Вялікая часць — быць даверанай асобай — на маю долю выпала ўтрэці раз. Добрую школу прайшла я ў часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Але і пасля выбараў я не парывала сувязі з выбаршчыкамі былога ўчастка. Па даручэнню партарганізацыі я прадаўжала кіраваць палітычнай агітацыяй сярод хатніх гаспадынь, рэгулярна праводзіла заняткі ў гуртку. І зараз я часта бываю ў сем'ях выбаршчыкаў, праводжу індывідуальныя гутаркі, адказваю на пытанні, вывучаю запатрабаванні і інтарэсы людзей.

Партарганізацыя швейнай фабрыкі «8 сакавіка» з'яўляецца галаўной на выбарчым участку № 1 Варашылаўскага раёна, дзе я вылучана даверанай асобай. Усю сваю работу я праводжу сумесна з партарганізацыяй.

Першыя крокі сваёй дзейнасці, як даверанай асобы, я пачала са складання прыкладнага плана работы на выбарчым участку на ўвесь перыяд падрыхтоўкі да выбараў. Мы правялі сумесную нараду агітатараў і членаў участковай выбарчай камісіі. Нарада дала станоўчыя рэзультаты. Агітатары і выбарчая камісія працуюць зараз у кантакце, арганізацыйныя і масава-палітычныя мерапрыемствы цесна спалучаюцца і паспяхова ажыццяўляюцца. Агітатары праводзяць гутаркі ў гуртках, прыходзяць на ўчастак, правяраюць спіскі выбаршчыкаў.

Значную ўвагу прыйшлося аддаць абсталяванню ўчастка, каб ператварыць яго ў сапраўдны цэнтр палітычнай агітацыі. Зараз тут ёсць газеты, мастацкая і палітычная літаратура, наладжаны дзяжурствы добра падрыхтаваных агітатараў.

У бліжэйшыя дні мы намецілі правесці сход з навучаючыміся 6-й школы, якая знаходзіцца на нашым выбарчым участку. Як і ў мінулай выбарчай кампаніі, піонеры дапамогуць нам у наладжванні нагляднай агітацыі. Яны таксама будуць забяспечваць яўку нашых выбаршчыкаў на сходы і ўсе іншыя масавыя мерапрыемствы.

У выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР выбаршчыкі майго ўчастка ўсе, як адзін, галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Прымяню ўвесь свой вопыт, прыкладу ўсе свае сілы да таго, каб выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных прайшлі з такім-жа поспехам.

Р. Ш. ГЕРШЭНЗОН.

РАЗГОРТВАЮ ПАЛІТЫЧНУЮ АГІТАЦЫЮ

Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных — адказная і палітычная кампанія. Зараз, калі вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ўжо ідзе поўным ходам, набывае вялікае значэнне палітычна-масавая работа на выбарчым участку. Дзейную барацьбу за перамогу на выбарах блока комуністаў і беспартыйных павінны весці даверaныя асобы.

Гэтымі днямі перадвыбарчая нарада 183-й выбарчай акругі па выбарах у Мінскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных выбрала мяне даверанай асобай па 19-му выбарчаму ўчастку.

Я скарыстаю ўвесь свой вопыт, набыты ў часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, калі я працаваў агітатарам.

Высокае давер'е, аказанае мне выбаршчыкамі, апраўдаю на практычнай рабоце. Зараз асноўную ўвагу ўдзяляю разгортванню палітычнай агітацыі. У гуртках рэгулярна праводзяцца заняткі, правяраю работу гурткоў, наведваю кватэры выбаршчыкаў, праводжу групавыя і індывідуальныя гутаркі.

Кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Совета працоўных па 183-й выбарчай акрузе вылучан дырэктар станкабудаўнічага завода імені Кірава тав. Золаў. Гэта — дастойны кандыдат, верны сын соцыялістычнай радзімы. Як кіраўнік прадпрыемства тав. Золаў змагаецца за выкананне вытворчага плана, за разгортванне стаханаўскага руху, клапоціцца аб паляпшэнні бытавых і культурных умоў рабочых, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Акруговая перадвыбарчая нарада, вылучыўшы мяне даверaным, даручыла агітаваць за кандыдатуру тав. Золава.

Мне, як даверанай асобе, прадстаіць вялікая работа. Я не пашкадую сваіх сіл, энергіі і здольнасцей, каб дабіцца паспяховага правядзення выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Д. Я. КУЗНЯЦОЎ.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РАЗГАРНУЦЬ АГІТАЦЫЮ ЗА КАНДЫДАТАЎ!

Пасяджэнне 29-й акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Дрысенскі раённы Совет дэпутатаў працоўных. НА ЗДЫМКУ: момант рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты раённага совета, лепшага стаханаўца-камбайнера Дрысенскай МТС М. П. Зайцава. Выступае старшыня камісіі Г. С. Тясто. Фото В. Лупейка. (Фотахроніка БЕЛТА).

ВЕРНАЯ ДАЧКА НАРОДА

Кандыдатам у дэпутаты Віцебскага абласнога совета вылучана Праскоўя Аляксееўна Галкіна — інжынер нашай чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ».

Тав. Галкіна з'яўляецца дачкой патомственых ткачоў. Больш поўвека працаваў яе бацька ткачом на былых Марозаўскіх мануфактурах у гор. Цверы, цяпер Калінін. Там-жа на працягу 30 год працавала і яе маці. Яны выпрабавалі на сабе ўсе «прыгожасці» капіталістычнага ладу — бяспраўе, гнёт, эксплаатацыю, голад і холад. Заработак бацькоў ні ў якім разе не мог забяспечыць вялікую сям'ю Галкіных, і Праскоўя, яшчэ будучы 13-гадовай дзяўчынкай, пасля сканчэння трох класаў школы пайшла працаваць швеяй.

У дні Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі тав. Галкіна працавала швеяй у школе кройкі і шыцця. А ўжо праз два годы яе, як лепшую работніцу, вылучылі інструктарам. Советская ўлада дала магчымасць Праскоўі аднавіць вучобу. Вельмі працавітая, яна, адначасова з работай на вытворчасці, вучыцца, рыхтуе сябе да паступлення ў навучальную ўстанову. З 1929 па 1933 год яна займаецца на рабфаку; паспяхова скончыўшы яго, паступае ў Маскоўскі тэкстыльны інстытут. Пяць год напружанай вучобы і Праскоўя — інжынер-тэхнолаг.

Добрая старасць у патомственага ткача Галкіна! Не толькі Праскоўя, але і ўсе астатнія яго дзеці атрымалі вышэйшую асвету. Ажыццявілася тое, аб чым ён і не смеў марыць у старыя, праклятыя час. Адзін сын у яго інжынер-меліяратар, другі — інжынер-хімік, трэці — галоўны інжынер аднаго буйнага завода, чацвёрты — вучыцца ў ваенна-транспартнай акадэміі, адна дачка — тэхнік, а другая — Праскоўя — інжынер-тэхнолаг. Сям'я Галкіных — гэта яркае ўвасабленне вялікіх магчымасцей, адкрытых для моладзі, для кожнага працоўнага чалавека ў нашай вялікай радзіме.

На нашу фабрыку Праскоўя Аляксееўна прыйшла прама з інстытута ў канцы 1938 года і з першых-жа дзён сваёй работы даказала, што яна адданая дачка свайго народа. Тав. Галкіна вельмі скромны чалавек, добры і чулы таварыш, заўсёды прыслухоўваецца да голасу рабочых, да іх запатрабаванняў.

Працуючы інжынерам-тэхнолагам у швейна-бялізнавым цэху, яна ўмела кіруе ўсім тэхналагічным працэсам, строга сочыць за правільнасцю рэжыма работы цэха. Пры яе актыўным удзеле на фабрыцы шырока ўкараняюцца новыя метады стаханаўскай работы — сумяшчэнне прафесій і аперацый на пашывачных лентах і т. д.

Таварыш Галкіна таксама добры грамадскі работнік. Яна з'яўляецца членам цэхавага камітэта, узначальвае масава-вытворчую групу цэхкома.

Кандыдатуру непартыйнага большэвіка — Праскоўі Аляксееўны Галкінай — аднадушна вылучыў наш сямітысячны калектыў фабрыкі. Нас горача падтрымалі калектывы ільнопрадзільнай фабрыкі імені Кагановіча, ушільфабрыкі, маслазавода, лесазавода «Правда», завода стандартных дамоў і мэблевай фабрыкі.

Мы ўпэўнены, што ўсе выбаршчыкі Кагановіцкай выбарчай акругі № 10 у знамянальны дзень выбараў — 24 снежня аддадуць свае галасы за верную дачку народа, кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — Праскоўю Аляксееўну Галкіну.

Інжынеры фабрыкі: **Я. Ш. ГУРЗВІЧ, А. В. БАСЮБІН,**
тэхнік **М. А. РУДАКОВА,**
майстры: **Л. І. СОСНЕР, А. І. ПУРЫНСОН,**
стаханаўкі: **О. А. ПУЧКОВА, Л. К. МЕЛЬНІКАВА, М. Л. СЕРАБРАКОВА, Ц. Х. ЛЕВІНА.**

КАНДЫДАТЫ ЗАВОДА ІМЕНІ МОЛАТАВА

Прасторнае, светлае памяшканне сталовай завода імені Молатава (Мінск) упрыгожана партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, лозунгамі, кветкамі і плакатамі. Больш 500 рабочых прысутнічаюць сёння на сходзе. Кожны член рабочага калектыва прыдае выключную ўвагу пастаўленаму на павестку дня пытанню — вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гарадского і Варашылаўскага раённага Советаў дэпутатаў працоўных.

Выступаючы загадчык кадрамі завода тав. Столяр уносіць прапанову кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадского совета вылучыць стаханаўца першага мэблевага цэха, сакратара заводскай комсамольскай арганізацыі тав. Пінчука.

— Тав. Пінчук — актыўны ўдзельнік грамадскай работы. Ён вельмі чулы да людзей, добры таварыш і друг. З творчым захапленнем тав. Пінчук бярэцца за кожную малую або вялікую справу, якую яму даручае партыя, комсамол. Так ахарактарызоўвае тав. Пінчука ў сваім выступленні тэхнік завода тав. Сідзельнікаў.

Услед за тав. Пінчуком сход вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Мінскага гарадского совета і іншых таварышоў: качагара-жанчыну тав. Патапчык, стаханаўца першага мэблевага цэха тав. Бурачэўскага, стаханаўку другога мэблевага цэха тав. Левінбам, дырэктара завода тав. Банвель. Усё гэта людзі, вырасшыя на прадпрыемстве, лепшыя стаханаўцы, актыўныя барацьбіты за выкананне вытворчага плана.

З выключным уздымам рабочыя галасавалі за вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадского совета начальніка пагранічных войск НКВД БССР, ордэнаносца, члена партыі з 1918 года Івана Аляксандравіча Багданава.

Кандыдатамі ў дэпутаты Варашылаўскага раённага совета вылучаны: актыўная хатняя гаспадыня тав. Розава, стаханаўка загатавіцельнага цэха тав. Ішчанка, стаханавец першага мэблевага цэха тав. Руткоўскі, тэхнік завода тав. Сідзельнікаў, стары рабочы з 30-гадовым вытворчым стажам, член партыі І. Столер, першы сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б тав. Тарасаў і маладая стаханаўка тав. Гвардыян.

А. А.

★

УЗОРНА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА ВЫБАРАЎ

(Гутарка з старшынёй Магілеўскай абласной выбарчай камісіі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Т. Г. Марозавым).

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Магілеўскай абласной выбарчай камісіі тав. Марозаў расказаў, як разгортваецца па вобласці падрыхтоўка да дня выбараў у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

— Як і на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, — сказаў тав. Марозаў, — працоўныя Магілеўскай вобласці дэманстрыруюць сваю бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна, сваю гатоўнасць змагацца за новыя перамогі соцыялізма. Аб гэтым сведчыць тое велізарнае аднадушша, з якім на прадпрыемствах, у калгасах і ўстановах прайшло вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога Совета.

Па вобласці вылучан і зарэгістрыраван 91 кандыдат у дэпутаты абласнога Совета. Каго-ж вылучае народ у орган дзяржаўнай улады? Лепшых людзей, правераных на штодзённай узорнай працы на карысць нашай соцыялістычнай радзімы, даказаўшых сваю адданасць справе партыі Леніна—Сталіна. Сярод іх інжынер Магілеўскай шоўкавай фабрыкі, узнагароджаны ордэнам «Знак почета»—Галіна Грыгор'еўна Собалева, старшыня калгаса імені Валадарскага Магілеўскага раёна ордэнаносец Іван Нікалаевіч Каракін.

Па Дзмітравіцкай выбарчай акрузе Бярэзінскага раёна кандыдатам у дэпутаты зарэгістрыраван старшы конюх калгаса імені Мяснікова Марыя Нікалаеўна Еўдакімчык.

Сярод кандыдатаў мы бачым бабруйскага ўрача-хірурга — Церпугава Аляксандра Петровіча, трактарыстку Хоцімскай МТС—Рабпаву Фёклу Патапаўну, настаўніцу ордэнаноску Пязнанскай пачатковай школы Клімавіцкага раёна — Валенціну Фёдараўну Андрэеву і інш.

Гэта перадавыя людзі, якія, не шкадуючы сіл, штогадзінна множаць перамогі нашай радзімы. Гэта актыўныя грамадскія дзеячы, якія карыстаюцца вялікай любоўю ў насельніцтва. Многія з іх, як, напрыклад, цялятніца малочна-таварнай фермы Рудкоўскага сельсовета Мсціслаўскага раёна Ксенія Фёдараўна Каржуева,— зусім маладыя людзі. Таварыш Каржуева 1918 года нараджэння. Толькі советская ўлада дала магчымасць тав. Каржуевай вырасці ў дзяржаўнага дзеяча.

Зараз па ўсіх выбарчых акругах разгарнулася агітацыя за зарэгістрыраваных кандыдатаў. Асабліва добра пастаўлена работа ў раёнах (Крычаўскі, Мсціслаўскі і інш.), дзе партыйныя арганізацыі па-большэвіцку ўзначалілі яе. Сотні агітатараў агітуюць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Аднак сям-там агітацыя разгортваецца слаба. Напрыклад, на ўчастку № 12 Валадарскай выбарчай акругі горада Магілева з 6 гурткоў хатніх гаспадынь працуе толькі 1.

На ўчастках вывешаны спіскі выбаршчыкаў. На жаль, памылак нямала. У прадмесці Магілева — Лупалаве — у выбарчым спіску быў прапушчан жыхар Надзежынскай вуліцы; па Хацэтоўскай выбарчай акрузе № 77 Чавускага раёна быў выпадак, калі ў спіскі былі ўнесены памёршыя. Ёсць факты, калі пераблытаны прозвішчы. Усе гэтыя недахопы зараз ліквідуюцца. Выбарчыя спіскі — гэта важнейшыя дакументы выбарчай кампаніі, і ў іх не павінна быць ні адной памылкі.

Абласная камісія вядзе вялікую арганізацыйную работу. Большасць членаў камісіі знаходзіцца на месцах, у раёнах, дзе дапамагаюць разгортваць падрыхтоўку да выбараў. Праведзены нарады старшынь раённых камісій, старшынь і сакратароў акруговых выбарчых камісій.

Трэба яшчэ сказаць, што рад райвыканкомаў (напрыклад, Бярэзінскі, Дрыбінскі і Прапойскі) слаба праводзяць падрыхтоўку да выбараў. Да гэтага часу не ўсе выбарчыя ўчасткі забяспечаны памяшканнямі, не закончана абсталяванне раду ўчасткаў.

Уперадзе яшчэ многа работы, але мы прыложым усе сілы, каб узорна сустрэць дзень усенароднага свята — 24 снежня, дзень, калі советскі народ будзе аднадушна галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

ЗАДАЧЫ ДАВЕРАНЫХ АСОБ

Наша вялікая краіна ўступіла ў самы адказны перыяд выбарчай кампаніі. Партыйныя, комсамольскія, прафсаюзныя, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі і таварыствы вылучаюць дастойных людзей, бязмежна адданых соцыялістычнай радзіме, партыі Леніна—Сталіна, кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых органаў дзяржаўнай улады. На прадпрыемствах, у калгасах, соўгасах, советскіх установах, навучальных установах, на выбарчых участках разгортваецца большэвіцкая агітацыя за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Арганізацыйная і палітычна-масавая работа перанесена зараз на выбарчы ўчастак, дзе рабочыя, калгаснікі, советская інтэлігенцыя атрымліваюць поўныя і ўсебаковыя адказы па пытаннях выбарчага закона. Выбарчы ўчастак — гэта цэнтр палітычнай агітацыі за кандыдатаў у дэпутаты мясцовых советаў. У гэты перыяд на выбарчым участку асабліва вялікую работу павінны разгарнуць даверaныя асобы, выбраныя на акруговых перадвыбарчых сходах. Выбаршчыкі аказалі высокае давер'е гэтым таварышам, даручылі ім агітаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за перадавых людзей нашай соцыялістычнай краіны.

Даверaная асоба з'яўляецца ўпаўнаважаным тысяч працоўных. Таварыш Сталін заўсёды вучыў і вучыць нашу партыю даражыць давер'ем советскага народа, апраўдваць яго на практычнай рабоце. Даверaныя асобы — гэта партыйныя і непартыйныя большэвікі, якія павінны агітаваць за вылучаных кандыдатаў, каб яны былі аднадушна выбраны дэпутатамі. Моцная сувязь з масамі — найпершы абавязак даверанай асобы.

Партыйны або непартыйны большэвік, надзелены паўнамоцтвамі даверанай асобы, павінен уясніць сабе, што яго свяшчэнны абавязак — забяспечыць пагалоўнае галасаванне ўсіх выбаршчыкаў за кандыдатаў, зарэгістраваных акруговымі выбарчымі камісіямі. Гэта абавязвае даверaныя асобы сур'ёзна агітаваць за выстаўленых кандыдатаў. У гуртках хатніх гаспадынь, на агульных сходах выбаршчыкаў трэба азнаёміць масы з біяграфіямі кандыдатаў, расказаць аб іх заслугах перад соцыялістычнай радзімай, аб іх бязмежнай адданасці партыі Леніна—Сталіна.

Вакол кожнага выбарчага ўчастка вырасла многа актывістаў выбарчай кампаніі, агітатараў, якія праводзяць заняткі ў гуртках, раз'ясняюць насельніцтву выбарчы закон, Сталінскую Канстытуцыю. Агітатары і прапагандысты на занятках гурткоў, на мітынгах і сходах усюды павінны простымі большэвіцкімі словамі расказаць аб грандыёзных перамогах соцыялізма ў нашай краіне, аб заможным, культурным і радасным жыцці працоўных, аб непераможнай магутнасці нашай гераічнай Чырвонай Арміі.

Усе поспехі, усе гістарычныя перамогі Советскага Саюза дасягнуты пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і вялікага правадыра працоўных усяго свету таварыша Сталіна. Агітацыя фактамі, пераканаўчымі цыфрамі соцыялістычных перамог дакажуць кожнаму рабочаму, калгасніку, советскаму інтэлігенту, што яны павінны выбраць у мясцовыя советы дзяржаўнай улады кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Поспехі выбарчай кампаніі залежаць ад разгортвання палітычна-масавай работы на выбарчым участку. Таму даверaная асоба павінна сачыць за якасцю палітычнай агітацыі, за яе зместам, даходлівасцю да мас, яснасцю, палітычнай завостранасцю. Абавязак даверанай асобы — сачыць, каб у гуртках правільна раз'ясняліся выбарчы закон, Сталінскую Канстытуцыю, міжнародныя і ўнутраныя падзеі. Палітычна змястоўныя гутаркі, заняткі ў гуртках, агульныя сходы выбаршчыкаў узнімаюць актыўнасць мас, нараджаюць ініцыятыву, энергію, спрыяюць выкананню гаспадарчых задач.

Праводзячы гэтую вялікую і адказную палітычную работу, неабходна памятаць, што дзе-ні-дзе варожыя элементы паспрабуюць скарыстаць у сваіх мэтах выбарчую кампанію. Значыць, палітычная агітацыя павінна спрыяць выкрыццю да канца астаткаў варожых элементаў, павышэнню рэволюцыйнай пільнасці і непрымірымасці да ворагаў.

Ужо зараз трэба рашуча ўзяцца за ліквідацыю недахопаў у арганізацыйна-тэхнічнай рабоце па выбарах. Абавязак даверанай асобы — прасачыць за тым, каб правільна былі складзены спіскі выбаршчыкаў, каб у іх былі ўключаны ўсе грамадзяне, маючыя права галасаваць. Трэба правесці старанную праверку спіскаў, прыдаўшы гэтай справе палітычнае значэнне. Выбарчы ўчастак трэба добра ўпрыгожыць лозунгамі, плакатамі, партрэтамі, устанавіць дзяжурствы членаў выбарчай камісіі.

Партыйныя арганізацыі павінны ствараць усе ўмовы для работы даверaных. Яны забяспечваюць выбарчы ўчастак неабходнай літаратурай, плакатамі, лозунгамі, вылучаюць падрыхтаваных агітатараў. Даверaная асоба зможа справіцца са сваёй работай толькі пры дапамозе партыйнай арганізацыі і апіраючыся на вырасшы беспартыйны актыў.

Работа даверанай асобы мае вялікае палітычнае значэнне. Райкомы партыі і райсоветы павінны акружыць даверaных увагай, арганізоўваць для іх даклады па розных палітычных пытаннях, праводзіць рэгулярна нарады, дапамагаць ліквідаваць недахопы ў рабоце, усямерна заахвочваць ініцыятыву і добры вопыт.

Сёння ў нашай газеце апублікавана некалькі выступленняў даверaных асоб, у якіх таварышы расказваюць аб пачатку работы на выбарчым участку, аб разгортванні агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У гэтых выступленнях паказана ініцыятыва і вопыт даверaных асоб, іх планы работы. Трэба ўсім даверaным падхваціць перадавы вопыт, каб падрыхтаваць палітычна ўсіх выбаршчыкаў да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Справа чэсці кожнага райкома партыі, кожнага комуніста — дапамагчы даверанай асобе разгарнуць сярод выбаршчыкаў большэвіцкую агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Справа чэсці кожнай даверанай асобы — згуртаваць на выбарчым участку ўсю масу рабочых, калгаснікаў, советскай інтэлігенцыі, забяспечыць іх аднадушнае галасаванне за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за верных сыноў соцыялістычнай радзімы, бязмежна адданых вялікай партыі Леніна—Сталіна.

М. АСТАПЕНКА.

АБ СРОДКАХ ПЕРАСОЎВАННЯ

У Чырвонапольскім раёне створаны тры акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у Магілеўскі абласны Совет дэпутатаў працоўных. Камісіі своечасова прыступілі да работы. Здавалася-б, раённыя арганізацыі павінны былі ўсяляк садзейнічаць рабоце камісій. Але на справе атрымліваецца зусім іншае.

21 кастрычніка мы былі выкліканы ў раён для паездкі ў Магілеў. Толькі праз два дні нам далі аўтамашыну. У Магілеў сяк-так даехалі, а назад вымушаны былі вяртацца, як хто мог. Гэтая паездка адарвала нас ад непасрэднай работы больш, чым на тыдзень. У другі раз старшыні і сакратары акруговых выбарчых камісій былі выкліканы ў горад Крычаў на куставую нараду. Туды нас даставілі на аўтамашыне райана. Але назад прышлося зноў дабірацца з вялікімі цяжкасцямі, трапіць на адну паездку цэлыя дні.

Гэта не адзінкавыя выпадкі. Усякі раз, калі выбарчым камісіям патрэбна выязджаць або дастаўляць матэрыялы ў абласную камісію, пачынаецца доўгая цягніна з сродкамі перасоўвання, не гледзячы на тое, што ў раёне больш 80 аўтамашын.

Старшыні акруговых выбарчых камісій: **ПУПЛІКАВА, ЦІМАШЭНКА, ПОКЛАД.**

З ВЯЛІКАЙ АКТЫЎНАСЦЮ

ДОБРУШ. (Кар. «Звязды»). Сваіх лепшых людзей, верных сыноў соцыялістычнай радзімы вылучаюць працоўныя Добрушскага раёна кандыдатамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Пры вялікай палітычнай актыўнасці праходзяць перадвыбарчыя сходы на папяровай фабрыцы «Герой працы» і ў калгасах раёна. Многатысячны калектыў фабрыкі «Герой працы» вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Гомельскага абласнога Совета лепшую стаханаўку тав. Гутараву і сакратара абкома партыі тав. Былінскага. Кандыдатамі ў дэпутаты гарадского Совета вылучаны дырэктар фабрыкі тав. Цэйтлін Барыс Абрамавіч, лепшы брыгадзір сартыровачнага цэха тав. Леўкова Анна і іншыя.

Сход настаўнікаў Кастрычніцкай НСШ аднадушна вылучыў кандыдатам у дэпутаты райсовета настаўніцу-ордэнаноску тав. Галінкую і кандыдатам у дэпутаты горсовета ўзнагароджаную ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга — народную настаўніцу тав. Ефрасінню Прайс.

Настаўнікі Крупецкай НСШ вылучылі кандыдатам у дэпутаты райсовета настаўніцу-ордэнаноску тав. В. Б. Галубкову.

З вялікім уздымам праходзіць у раёне вылучэнне кандыдатур у сельскія советы. Калгасніца сельскагаспадарчай арцелі «Абарона» тав. Елізавета Капыткова бязменна з'яўляецца членам Кармянскага сельсовета ўжо некалькіх скліканняў. Яна прымае актыўны ўдзел у рабоце совета. Калгаснікі аднадушна вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты Кармянскага сельскага совета.

Н. ГІРШЫН.

Партыйнае жыццё

БАЯВЫЯ ПАСЛАНЦЫ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Баявая гісторыя доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі беражліва захоўвае тысячы прыкладаў беззаветнай храбрасці пасланцоў партыі Леніна—Сталіна, ваяўнічых большэвікоў — слаўных чырвонаармейскіх камісараў, якія згуртоўвалі чырвонаармейскія валы вакол большэвіцкай партыі, вакол Леніна і Сталіна. Большэвікі-камісары нярэдка кроўю сваёй пэментыравалі баявое адзінства Чырвонай Арміі.

Камісары насілжалі жалезную воінскую дысцыпліну, выхоўвалі самаадданасць і баявую адвагу. «Без военкома мы не мелі-б Чырвонай Арміі» — гаварыў Уладзімір Ільіч Ленін.

Баявая слава камісараў была ва ўсёй велічы ўвасоблена героямі-хасанаўцамі. Светлы вобраз большэвіцкага пасланца Івана Пажарскага ніколі не памрэ ў памяці народа.

Такімі, як Пажарскі, былі дзесяткі баявых камісараў Беларускага фронта. У свяшчэннай вайне за вызваленне адзінакроўных братоў ад панскай кабалы камісары часцей і фронта ўнеслі ў гісторыю новыя яркія старонкі.

...Камісар Шахтмейстар у галаўной машыне штурмаваў умацаванні, узведзеныя афіцэрскімі бандамі ў горадзе Н. З лахаў дамоў, з акон верхніх паверхаў на адважных танкістаў ляцелі бутэлькі з палаючым бензінам. Пад гусеніцамі ірваліся гранаты. Па броні машын яяспынна барабаніў свінцовы дожджж. Камісар сядзеў ля кулямёта. Кароткімі чаргамі ён хладнакроўна граміў агнявыя точкі ворага. Не адзін афіцэрскі кулямёт замаўкаў, не адно поллае жыццё абарвалася пад меткімі кулямі камісара.

Нечакана танк астанавіўся. Адна з яго гусеніц была перабіта снарадам.

Вораг ўзмацніў агонь, загадзя таржаствуючы перамогу. Некалькімі выстрамі экіпаж пашкоджанага танка прымусіў змоўкнуць баявыя точкі ворага. Тав. Шахтмейстар прыпадняў крышку люка. Недзе з боку ўзвізгнула куля. Рука камісара абагрылася крывёю. Ён на мінуту закрыў люк, наспех перавязаў рану. І зноў адкінуў крышку люка і з кулямётам у руках выскачыў з танка. Ворагі ўзмацнілі агонь. Камісар бясстрашна адказваў на выстралы кулямётным ліўнем. Башнёры стралок Іваннікаў уторыў камісару з танка. Варожы агонь сціхаў, падаўлены агнём танкістаў. Подлыя шакалы — афіцэры не асмельваліся падняць галовы. Гэта скарыстаў вадзіцель танка Маісееў. Ён вылез з машыны і быстра справіў пашкоджанне. Машына зноў рынулася ў бой. Ранены камісар быў на баявым посту да поўнага знішчэння ворага.

Бясспрыкладную адвагу праявіў камісар Багамолаў. На подступах да горада П. яго часць атрымала баявую задачу: прарваць варожыя агарожы, праскачыць праз горад, заняты ворагам, не даць афіцэр'ю ўзарваць мост праз раку. У галаўную машыну сеў камісар Багамолаў. Яго танк, нібы віхр, праімчаўся па гораду, знішчаючы варожыя кулямёты. Вораг усімі спосабамі прабаваў астанавіць бег магутных машын. Але не ўдалося! Машына камісара прабілася да маста. Падпалены ў некалькіх месцах, мост пылаў. Камісар рынуўся к масту і, не звяртаючы ўвагі на свінцовы дожджж, выскачыў з машыны. Натхнёныя яго ўчынкам, з машыны вышлі яшчэ некалькі байцоў. Пад кулямі, кіруемыя камісарам, байцы быстра патушылі пажар. Мост быў выратаван. Поллы замысел ворага не ўдаўся. У гэтым баю быў ранен вадзіцель машыны Сальнікаў. Броня машыны мела 16 прабоін.

Знахідлівасць і адвагу праявіў камісар тав. Зазімка. Ён быў з невялікай групай танкаў, якая наскочыла на калону польскай кавалерыі. Салдаты пад прымусам афіцэр'я рыхтаваліся сустрэць танкі агнём. Тады камісар тав. Зазімка выскачыў з машыны.

— Здавайцеся, — крыкнуў ён салдатам. — Мы нясем вам вызваленне ад гнёту праклятых паноў.

Некалькі афіцэраў падняялі зброю. У адказ танкісты павярнулі на калону кулы гармат.

— Хто страляе па нас, той за паменшчыкаў і капіталістаў, — крыкнуў ён.— Хто за свабоду беларускага народа — складвай зброю.

Словы вогненай большэвіцкай праўды дайшлі да сазнання польскіх салдат. Быстра абязброіўшы афіцэраў, салдаты склалі зброю. Знаходлівасць камісара папярэдзіла кровапралітную схватку.

Бясспрыкладную смеласць і адвагу праявілі камісары Кузьмін Капуспін і дзесяткі іншых. Іх баявы прыклад нараджаў масавы гераізм, узнімаў яшчэ вышэй палкі совецкі патрыятызм.

Палітрук П. ТУРСКІ.

ДЗЕНЬ У ПАРТЫЙНЫМ КАБІНЕЦЕ

...11 гадзін раніцы.

У невялікі пакой загалчыка партыйным кабінетам зайшоў сакратар адной з пярвічных партыйных арганізацый горада тав. Рубан.

Малады агіткалектыў, якім кіруе тав. Рубан, абслугоўвае людзей з розным кругам ведаў, вопыту, з розным культурным узроўнем. Натуральна, што для іх патрэбен розны падыход пры гутарках. Вось аб гэтым і запытваў тав. Рубан. Тут яму раз'яснілі цікавячае яго пытанне.

Так пачаўся рабочы дзень у партыйным кабінеце. За гэты дзень прышлі сюды розныя людзі з рознымі пытаннямі.

Вось зайшоў дырэктар Лашыскай сярэдняй школы тав. Жараў. Яго цікавіць як лепш вывучыць IV раздзел Кароткага курса, пытанні дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма. Калі з тав. Жаравым пагаварылі, ён зразумеў, што для таго, каб глыбока вывучыць філасофскую частку IV раздзела Кароткага курса, трэба дэталёва пазнаёміцца з класічнымі філасофскімі работамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, у першую чаргу з работай Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм».

Многа таварышаў у гэты дзень працавалі ў кабінеце над рознымі пытаннямі. Член партыі тав. Сільвійструк працаваў над пытаннямі калектывізацыі сельскай гаспаладаркі, аснашчэння яе машынамі. Старшыня райвыканкома тав. Кароль палбіраў матэрыялы па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў. Бібліятэка за дзень абмяняла і выдала на дом 19 таварышам розныя кнігі. Людзі працуюць, вучацца, накапляюць тэарэтычныя веды.

***

Кабінет карыстаецца сапраўды заслужаным аўтарытэтам і павагай сярод працоўных раёна. За дзень у партыйны кабінет звяртаюцца з рознымі пытаннямі 20 і больш чалавек. Тут ёсць чытальня, пакоі для індывідуальнай кансультацыі, для работы гурткоў па гісторыі партыі, багатая бібліятэка, якая перыядычна папаўняецца. Толькі ў гэтым годзе для бібліятэкі закуплены 2 тысячы тамоў рознай літаратуры.

Для самастойна вывучаючых гісторыю партыі ёсць альбомы, картатэкі па 10 раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

У кастрычніку ў партыйным кабінеце былі арганізаваны 3 групавыя кансультацыі аб Заходняй Беларусі, кансультацыя па міжнародным становішчу. Іх правялі заг. партыйным кабінетам тав. Пікула, загалчык аддзелам прапаганды і агітацыі райкома партыі тав. Гершман. Дырэктар сярэдняй школы тав. Зельцэр правёў кансультацыю па пытанню размяшчэння продукцыйных сіл у трэцяй пяцігодцы.

Індывідуальныя кансультацыі даюцца штодзенна.

Партыйны кабінет Асіпавіцкага раёна становіцца сапраўдным арганізуючым цэнтрам партыйнай вучобы ў раёне.

З. МЯЦЕЛІЦА.

ДАПАМАГЧЫ РАЗВІЦЦЮ МАСТАЦТВА ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР

Нават беглае азнаямленне са становішчам мастацтва на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі дае магчымасць ясна ўявіць сабе карціну выключнага заняпаду ўсіх відаў мастацтва. Мастацтва—беларускае, украінскае, рускае, яўрэйскае—праследвалася і растаптвалася панскім ботам.

Гарады і мястэчкі Заходняй Беларусі абслугоўваліся пераязджаўшымі з месца на месца тэатральнымі трупамі. Гэта былі сугуба правінцыяльныя — у старым для нас разуменні гэтага слова — тэатры. Акцёрскай культуры, змястоўнага рэпертуара, больш-менш здавальняючага афармлення ад такога тэатра нельга было і чакаць.

Некаторым трупам ледзь удалося да бліцца дазволу на пастаноўку аднаго-двух спектакляў у месяц. Беспрацоўе сярод акцёраў было велізарным. Старыя вопытныя акцёры вымушаны былі займацца продажам ліманаду і іншымі палобнымі спосабамі выратоўваць сябе ад галоднай смерці.

Шматлікім злосакам і праследваннямі падвяргаўся яўрэйскі тэатр. Галоднае, бясправнае, аплёванае жыццё акцёрства не магло, зразумела, спрыяць стварэнню сапраўдных твораў тэатральнага мастацтва.

Нават і польскі — прывілегіраваны— тэатр знаходзіўся ў далёка не бліскучым становішчы.

Становішча акцёрскіх труп можна досыць дакладна ўявіць сабе, знаёмячыся з тэатральнымі будынкамі. Брудныя, заплёваныя, не прыстасаваныя для колькі-небудзь сур'ёзнай пастаноўкі сцэны, песныя, душныя каморкі — акцёрскія пакоі, адсутнасць рэпетыцыйных памяшканняў, складаў для дэкарацый, памяшканняў для тэхнічных цэхаў — вось малюнак гэтых тэатраў.

Зараз у буйнейшых цэнтрах заходніх абласцей БССР окапілася вялікая колькасць работнікаў мастацтваў. У Беластоку знаходзіцца трупа віленскага рускага тэатра, звыш 40 яўрэйскіх акцёраў, многа мастакоў, сярод якіх ёсць буйныя майстры, многа дзесяткаў выдатных музыкантаў і т. д. У Гродна працуе польская трупа, выехаўшая з Вільна, трупа яўрэйскіх акцёраў на чале з вядомым акцёрам і рэжысёрам А. Марэўскім, сімфанічны аркестр, два хоры і т. д. У Брэст-Літоўску быўшыя беспрацоўныя акцёры арганізавалі рад канцэртных брыгад.

Усе яны гарэць жаданнем хутчэй стварыць сапраўдныя ўзоры мастацтва. Тое, што яны чулі аб совецкім мастацтве і аб адносінах да мастацтва ў нашай краіне, тое, што яны паспелі ўжо бачыць уласнымі вачыма, напаўняе іх захапленнем і велізарнай радасцю.

У заходніх абласцях БССР паспелі паказаць свае спектаклі ўжо пэлы пад тэатраў БССР: мінскі Беларускі дзяржаўны тэатр паказаў спектаклі «Партызаны» і «Падзь Сярэбраная», Беларускі тэатр юнага гледача — спектакль «Цудоўная дудка», Яўрэйскі тэатр паставіў спектаклі «Тэв'емалочнік» і «Гершеле Остраполер». Выязджалі ў заходнія вобласці БССР таксама Заслаўскі калгасна-соўгасны тэатр, Палескі абласны драматычны тэатр, Бабруйскі калгасна-соўгасны тэатр, брыгада салістаў Тэатра оперы і балета на чале з Л. П. Александроўскай, ансамбль беларускай песні і пляскі, аркестр народных інструментаў, хор Беларускай дзяржаўнай філармоніі, розныя калектывы самадзейнага мастацтва.

За ўсе 20 год існавання польскай «дзяржавы» тут не бачылі ні такой колькасці калектываў, ні, тым больш, такой якасці твораў тэатральнага і музычнага мастацтва, як за гэтыя некалькі тыдняў. Трэба было бачыць, з якім захапленнем прымалі тут совецкіх акцёраў. Гэта выходзіла далёка за рамкі чыста мастацкіх успрыняцяў. Лікуючыя крыкі «ура», грамавыя апладысменты патрасалі залы тэатраў.

З першых-жа дзён вызвалення Заходняй Беларусі часовымі ўпраўленнямі былі прыняты меры па ліквідацыі беспрацоўя сярод работнікаў мастацтваў і па аказанню ім матэрыяльнай дапамогі. Акцёры, музыканты, мастакі з вялікім энтузіязмам абслугоўвалі выбаршчыкаў у дні падрыхтоўкі выбараў у Народнае Сабранне, афармлялі гарады да вялікага свята Кастрычніка.

Не так даўно з паездкі па заходніх абласцях БССР вярнуліся брыгады Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. Брыгады правялі ўчот кадраў работнікаў мастацтваў, знаёміліся з імі і памячалі мерапрыемствы па развіццю мастацтва.

У гарадах заходніх абласцей БССР будуць створаны дзяржаўныя тэатры на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах, а таксама спецыяльныя тэатры для абслугоўвання вёсак. Будуць арганізаваны вялікія музыкальныя калектывы: ансамбль песні і пляскі, сімфанічныя аркестры і т. д. Можна не сумняваццa, што ў нетрах беларускага народа на тэрыторыі заходніх абласцей БССР тоіцца многа выдатных талентаў, якія цяпер будуць закліканы да актыўнага творчага жыцця.

Рад лепшых музыкантаў, спевакоў, мастакоў, акцёраў увальецца ў нашы існуючыя калектывы і ўзбагаціць наш оперны тэатр, тэатр музкамедыі, філармонію, драматычныя тэатры, саюз мастакоў новымі высока адароннымі кадрамі. Многія з іх ужо знаходзяцца ў Мінску.

Відавочна, пры Беларускай кансерваторыі цэлінна быць арганізавана спецыяльнае аддзяленне для абучэння таленавітай моладзі заходніх абласцей БССР.

Гэта будзе садзейнічаць новаму велізарнаму ўздыму мастацтва ўсёй нашай, цяпер з'еднанай, Совецкай Беларусі.

М. ЮДЗЕЛЕВІЧ.

ДА 15-ГОДДЗЯ ТУРКМЕНСКАЙ ССР. НА ЗДЫМКУ: комсамолец Байты Ша Кулієў праводзіць сярод калгаснік калгаса імені Варашылава гутарку аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных (Сталінскі раён, Туркменская ССР).

Фото В. Лашманова. (Фота-кліше ТАСС).

24 лістапада 1859 г. вышла з друку навуковая праца Ч. Дарвіна „Паходжанне відаў"

ГЕНІЯЛЬНЫ ТВОР Ч. ДАРВІНА

Восемдзесят год назад 24 лістапада 1859 года — упершыню быў апублікован адзін з геніяльнейшых твораў сучаснага прыродазнаўства — «Паходжанне відаў» — Чарльза Дарвіна.



Вялікае значэнне гэтай выдатнай працы асноваположнікі навуковага соцыялізма Маркс і Энгельс бачылі перш за ўсё ў тым, што Дарвін нанёс сакрушальны ўдар па метафізіцы ў прыродазнаўчых навуках.

Пераважная большасць вучоных да дарвінаўскага перыяда падтрымлівала нічога не аб'ясняючую біблейскую легенду аб тым, што ўсе зараз існуючыя віды жывёл і раслін, ва ўсёй іх разнастайнасці і дасканаласці, былі калісьці створаны незалежна адзін ад аднаго, шляхам божаственага творчага акта, і з таго часу астаюцца нязменнымі. «Да апошняга часу, — піша Дарвін ва ўводным нарысе да «Паходжання відаў», — значная большасць натуралістаў была пераконана, што віды продстаўляюць штосьці нязменнае і былі створаны незалежна адны ад адных» (Дарвін. Зб. тв. III, стар. 261, выд. Акад. навук. 1939 г.).

Дарвін выступае супроць гэтых, амаль безразлёсьна панаваўшых у навуцы ідэялістычных папоўскіх поглядаў. Ён апракідвае мяртвячае метафізічнае ўяўленне аб жывой прыродзе, знаходзячайся нібы ў стане «пакою і нерухомасці, застою і незмяняемасці», і дае шматлікія пераканаўчыя доказы таго, што арганічная прырода, як і прырода неарганічная, знаходзіцца ў стане «бесперапыннага руху і змянення, бесперапыннага абнаўлення і развіцця, дзе заўсёды штосьці ўзнікае і развіваецца, штосьці разбураецца і адмірае свой век» (І. Сталін «Аб дыялектычным і гістарычным матэрыялізме», гл. «Пытанні ленінізма», 11-е выд., стар. 537).

Трэба было сапраўды ўладаць якасцямі вялікага рэвалюцыянера навукі, каб кінуць выклік гэтаму тармозячаму развіццю прыродазнаўства ідэялістычнаму светапогляду, каб «ламаць старае і ствараць новае, не гледзячы ні на якія перашкоды, наперакор усяму» (Сталін). І Дарвін уладаў гэтымі якасцямі.

Дарвін выдатна прадстаўляў сабе тыя, амаль непераадалімыя труднасці, перад якімі стаяла яго вучэнне, уступаючае ў рэзкі канфлікт з асноўнымі поглядамі царквы і пануючых класаў. У пісьме да свайго друга і аднадумца Гукера ў 1849 годзе, г. зн. за 10 год да выхаду «Паходжання відаў», Дарвін пісаў: «Хапя мне прадстаіць больш пінкоў, чым пенсаў, я не адмоўлюся, калі толькі жыццё дазволіць, ад сваёй працы».

Для доказу эволюцыі Дарвін прыцягвае таксама параўнаўчую анатомію. Ён бліскуча паказвае, што адзіўляючае адзінства ў пабудове ралу органаў, у першую чаргу скелета канечнасцей такіх розных арганізмаў, як земнаводныя, паўзуны, птушкі, нарэшце, такіх сысуноў, як кіт, конь, чалавек. з'яўляецца вынікам таго, што ўсе яны калісьці паходзілі ад агульных продкаў, г. зн. маюць агульнае паходжанне. Адрозненне-ж у іх будове ёсць результат эволюцыі, паступовых змяненняў, пралаўжаўшыхся мільёны год.

У адрозненне ад большасці сучасных яму вучоных, прапаваўшых адарвана ад практыкі, Дарвін важнейшыя творчыя ідэі свайго вучэння чэрпаў з практыкі. Іменна поспехі ў актыўнай перадзелцы раслін і жывёл, якія назіраў Дарвін, прывялі яго да выдатных вывадаў: калі зусім дакладна на магчымасць змянення відаў хатніх жывёл пад уплывам чалавека, то гэтым самым даказваецца і магчымасць змянення жывёл і раслін у прыродзе на працягу эпох. Калі чалавек неабходныя яму змяненні атрымлівае шляхам штучнага адбору, то гэтыя-ж змяненні ў прыродзе дасягаюцца шляхам прапяглага прыроднага адбору на працягу мільёнаў год.

Дарвін пераканаўча паказаў, што іменна прыродны адбор, які чэрпае дзеючыя «барацьбе за існаванне» матэрыялы з асноўных уласцівасцей арганізма — велізарнай размнажаемасці, зменчывасці і спадчыннасці, — з'яўляецца асновай эволюцыі, яе рухаючай сілай. Усе арганізмы, як паказвае Дарвін, уладаюць выключнай здольнасцю да размнажэння.

Веліч дарвінскага вучэння ў тым, што ён не толькі даказаў эволюцыю, але і паказаў, што назіраемая намі ў прыродзе адносная дасканаласць — результат прыроднага адбору, а не прадустаноўленай, спрадвечнай гармоніі.

За 80 год, прайшоўшых з часу апублікавання кнігі Дарвіна, яго вучэнне стала асновай прыродна-навуковага разумення з'яў прыроды. Шматлікія новыя доказы эволюцыі і яе рухаючых сіл, якімі ўзбагацілася сучасная навука, значна ўмацавалі сілу дарвінскіх доводаў.

Дарвінізм ва ўмовах капіталістычнай гаспаладаркі знаходзіцца ў крайнім загоне нават у якасці асновы для практычнай перадзелкі сельскай гаспаладаркі.

Толькі ў Совецкім Саюзе, наперакор усякім спробам скажэння дарвінізма, вучэнне Дарвіна атрымала выключны магчымасці для бурнага росквіту.

Аслабаняемае на аснове марксісцка-ленінскага аналіза ад асобных памылак і недачотаў, вучэнне Дарвіна астаецца алізна навуковай тэорыяй развіцця арганічнага свету. Аб гэтым красамоўна гаворыць і выдатная дзейнасць вялікага рускага батаніка і выдатнага дарвініста І. В. Мічурына, узбагаціўшага нашу краіну шматлікімі новымі сартамі і відамі пладовых раслін; выдатныя практычныя поспехі, дасягнутыя акадэмікам Т. Д. Лысенка ў кіраванні сталыйным развіццём раслін (азімасцю і яравасцю); атрыманне многагадовых сартоў пшаніцы акадэмікам Н. В. Цыцыным (шляхам скрыжавання яе з пустазеллем пыраем) і таленавітым наватарам А. Дзержавіным (шляхам скрыжавання пшаніцы з дзікім многагадовым горным жытам, растучым у Арменіі) і іншыя даследванні совецкіх вучоных. І чым іншым, як не выдатным дасягненнем дарвінізма, з'яўляецца стварэнне прафесарам Грышко адначасова паспяваючых канапель, што літаральна выпраўляе недахопы прыроды. Поспехі шматлікай арміі калгаснікаў-селекцыянераў — гэтай новай выдатнай пораслі калгасных дарвіністаў-мічурынцаў — таксама з'яўляюцца ўвасабленнем дарвінізма ў жыцці.

Вялікія поспехі соцыялістычнага раслінаводства і жывёлагадоўлі, поспехі нашай медыцыны, біялогіі і іншых галін прыродазнаўства пераканаўча пацвярджаюць не толькі росквіт дарвінізма ў СССР, але і тое, што толькі нам, краіне соцыялізма, па праву належаць усе заваяванні многавяковай чалавечай культуры.

І. АМЛІНСКІ.

15-годдзе Туркменскай ССР

—★—

А. ХУДАЙБЕРГЕНАЎ

Старшыня СНК Туркменскай ССР, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР і ТуркССР.

—⊙—

24 лістапада 1939 года працоўныя Туркменіі святкуюць 15-годдзе ўтварэння Туркменскай ССР.

Сустракаючы слаўную 15-ю гадавіну ТССР, туркменскі народ, поўны гордасці і шчасця, бачыць, як Туркменія, адсталая каланія царскай Расіі, мінуючы мучэльную стадыю капіталізма, ператварылася за годы совецкай улады ў перадавую соцыялістычную рэспубліку на Усходзе Вялікая партыя Леніна — Сталіна, вызваліўшы народы нашай краіны ад векавога рабства, прывяла іх да радаснага і шчаслівага жыцця.

Прайшоўшыя 15 год былі годамі бурнага росту народнай гаспаладаркі і росквіту культуры туркменскага народа — нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

Найвялікшыя перамогі соцыялізма ў Туркменіі — трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

У рэзультаце нацыянальнага размежавання Туркестана туркменскі народ упершыню ў гісторыі здабыў адзіную нацыянальную тэрыторыю з адзіным нацыянальным кіраваннем.

Пры штодзённым падтрыманні саюзнага ўрада і рабочага класа Расіі ў Туркменіі пачала быстра развівацца маладая прамысловасць, з кожным годам расла прадукцыя сельскай гаспаладаркі.

Да рэвалюцыі прамысловасць у Туркменіі знаходзілася ў зародышавым стане і была прадстаўлена трыма дзесяткамі дробных бавоўназаводаў, поўсаматужнымі нафтапромыслямі і маслазаводам у Байрам-Алі.

За 15 год совецкі ўрад уклаў у прамысловасць Туркменіі 360 млн рублёў.

За годы сталінскіх пяцігодак у Туркменіі створаны новыя галіны прамысловасці: хімічная, нафтавая, тэкстыльная, шкляная, швейная, харчовая і інш.; пабудаваны дзесяткі буйных прадпрыемстваў. Аб магутнасці іх можна меркаваць па таму факту, што рэканструіраваны бавоўнаачышчальны завод у Чарджоу дае больш бавоўны-валакна, чым усе 29 бавоўназаводаў Закаспійскай вобласці далі ў 1916 годзе.

У пясках Кара-Кумаў, на берагах Каспія і Аму-Дар'і, у прадгор'ях Копет-Дага, на раўнінах Мургаба выраслі індустрыяльныя цэнтры.

У Туркменіі здабываюцца нафта, сульфат, азакерыт, сера, ёд, барыт, лакрычнік, соль. Вырабляюцца лепшыя ў свеце каўры, шоўк і інш. Звыш 90 проц. прамысловай прадукцыі вырабляецца на новапабудаваных і рэканструіраваных прадпрыемствах за годы першай і другой сталінскіх пяцігодак. У параўнанні з 1913 г. валавая прадукцыя буйнай прамысловасці ТССР у 1937 г. (у нязменных цэнах 1926/27 г.) вырасла ў 8 разоў, у параўнанні з 1924—25 г. — у 11 разоў. Развіццё прамысловасці непазнавальна пераўтварыла аблічча рэспублікі.

З краіны аграрнай, адсталай да рэвалюцыі, Туркменія ператварылася ў перадавую прамыслова-аграрную рэспубліку. Удзельная вага прамысловай прадукцыі ў народнай гаспаларцы ў 1937 г. склала 68,9 проц.

Разам з прамысловасцю выраслі нацыянальныя кадры рабочых. Калі да рэвалюцыі колькасць рабочых-туркмен вылічалася адзінкамі, у 1924 г. іх было каля 700, то к канцу 1937 г. на буйных прадпрыемствах рэспублікі і на транспарце працавала звыш 14 тыс. туркменаў. Каля 24 тыс. жанчын-туркменак занята ў каўровай вытворчасці. Велікі поспех туркменскага народа і ў галіне сельскай гаспаладаркі. 99 проц. дайханскіх гаспадарак калектывізавана. Совецкая ўлада аснасціла калгасы Туркменіі перадавой тэхнікай, стварыла ўсе ўмовы для механізацыі асноўных працэсаў сельскагаспадарчых работ. К канцу другой пяцігодкі рэспубліка мела 49 МТС з 4 тыс. трактараў і складанымі сельскагаспадарчымі машынамі. У 1938 г. на 69 проц. бавоўнавай плошчы ворыва праведзена трактарамі. Пад зябліва ў мінулым годзе трактарамі ўзарана звыш 2/3 бавоўнавай плошчы. Вядучую ролю занялі трактары ў пасеве і культывацыі бавоўнніка. У буйных зернавых раёнах уборка зернавых праводзіцца ў асноўным камбайнамі. У вялікай колькасці атрымліваюць калгасы плугі, сеялкі, аўтамашыны і розныя сельскагаспадарчыя прылады.

Велізарная дапамога аказана совецкім урадам калгаснікам Туркменіі ў развіцці ірыгацыйнай сеткі. За 15 год у ірыгацыйнае будаўніцтва ўкладзена 128 млн. рублёў, узведзена звыш 1500 гідратэхнічных будоўляў, расшырана сетка каналаў. плошча паліўных зямель павялічылася на 103 тыс. гектараў.

Туркменскія дайхане да рэвалюцыі не мелі нават уяўлення аб агратэхніцы і зоатэхніцы. Ва ўсёй Закаспійскай вобласці было ўсяго 3 аграномы, якія працавалі ў царскім маёнтку ў Байрам-Алі, і 9 ветработнікаў. Пяпер у рэспубліцы працуе 569 аграномаў, 215 гідратэхнікаў, 110 землеўпарадчыкаў. 560 зоатэхнікаў і ветурачоў, звыш 6000 трактарыстаў і камбайнераў.

Чэсная праца асноўнай масы калгаснікаў, велізарная дапамога саюзнага ўрада, вялікага рускага народа, бальшэ і друга калгаснікаў — вялікага Сталіна— стварылі ўсе ўмовы для магутнага ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспаладаркі, заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў Туркменіі.

Пасеўная плошча бавоўны вырасла з 62,8 тыс. гектара ў 1925 годзе да 150 тыс. гектараў у 1939 годзе.

У 1938 годзе сабрана бавоўны сырцу ў 5,5 раза больш, чым у 1925 годзе. Ураджайнасць бавоўны ў 1938 годзе склала ў рэспубліцы: па амерыканскіх сартах — 16,3 цэнтнера з гектара і па егіпецкіх — 14,4 цэнтнера. План бавоўнанагатовак быў выканан на 120 проц. Пасеўная плошча ўсіх культур з 254 тыс. гектараў у 1925 годзе вырасла да 412 тыс. гектараў у 1939 годзе.

З кожным годам у рэспубліцы памнажаецца пагалоўе жывёлы. За апошнія 4 годы ў Туркменіі пагалоўе авечак і коз павялічылася на 90,4 процанта, у тым ліку каракульскіх авечак — у 2 разы; буйнай рагатай жывёлы — на 68 процантаў, свіней — на 146,7 процанта. Лік ферм у калгасах з 311 у 1933 годзе вырас да 1894 на 1 студзеня 1939 года. (Пасля пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі арганізавана 819 новых ферм). Пагалоўе буйнай рагатай жывёлы за гэты час у фермах павялічылася ў 2,4 раза, авечак і коз — у 2,8 раза.

Вялікія поспехі дасягнуты калгаснікамі Туркменіі ў развіцці шаўкаводства. За 15 год загатоўка коканаў павялічылася ў 45 разоў.

У гэтым годзе ў рэспубліцы сабран рэкордны ўраджай зернавых.

Калгасны лад вырасціў і выхаваў тысячы майстроў высокіх ураджаяў бавоўны, шаўкаводства і жывёлагадоўлі, таленавітых арганізатараў калгаснай вытворчасці. 280 калгасаў, 2 МТС, 8 соўгасаў і 2248 перадавікоў сельскай гаспаладаркі Туркменіі заваявалі права ўдзелу на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1939 года.

Умацаванне калгасаў, рост ураджайнасці і чэсная праца асноўнай масы калгаснікаў забяспечылі нябачаны ўмым матэрыяльнага добрабыту калгаснікаў Туркменіі. Грашовыя даходы калгасаў толькі за 1 год, з 1937 г. па 1938 г., выраслі з 270 млн. рублёў да 399 млн. руб. У мінулым годзе ў сярэднім кожная гаспадарка на працадні атрымала 2118 рублёў грашыма, не лічачы натуры. У 1938 г. у рэспубліцы налічвалася 38 калгасаў мільянераў. У перадавых калгасах на працадзень было выдана па 15—25 руб. Рад такіх калгасаў будуюць соцыялістычныя пасёлкі з двухкватэрнымі дамамі, клубамі, электрастанцыямі і культурна-бытавымі ўстановамі.

Калгаснікі Туркменіі жывуць заможна і шчасліва. Толькі ў калгасах дайхане ўбачылі сапраўднае жыццё, аб якім раней маглі толькі марыць.

За годы совецкай улады яркa расквітнела культура туркменскага народа — нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу.

У рэспубліцы—1336 пачатковых, нядоўных сярэдніх і сярэдніх школ з 231 тысячай навучаючыхся. У 17 раёнах уведзена ўсеагульнае абавязковае 7-гадовае навучанне. У калгасах Марыскага, Сталінскага, Каахкінскага і Геок-Тэпінскага раёнаў адкрыты школы-дзесяцігодкі. За 15 год у рэспубліцы пабудавана 575 новых школ. У Туркменіі ёсць 4 ВНУ, 38 тэхнікумаў, 5 рабфакаў з колькасцю каля 10 тысяч студэнтаў. Па пісьменнасці Туркменія займала адну з апошніх месц у царскай Расіі. Да свайго 15-годдзя Туркменская ССР прыходзіць з 76,9 проц. пісьменнага насельніцтва.

У 1939 г. на народную асвету асігнавана 226 млн. руб.

За годы совецкай улады выраслі рады нацыянальнай інтэлігенцыі — настаўнікаў, урачоў, аграномаў і інш. Колькасць апошніх толькі настаўнікаў дасягнула 7.000 чалавек.

Раней, у часе царызма, туркменскі народ не ведаў тэатральнага мастацтва, не чуў харавой песні, не бачыў танца. У совецкай Туркменіі мастацтва атрымала шырокае развіццё — ёсць 10 дзяржтэатраў, філармонія, вялікі нацыянальны музыкальны ансамбль, арганізуюцца оперная студыя і тэатр юнага гледача на туркменскай мове. Звыш 500 народных спевакоў—бахшы—спяваюць у калгасах песні аб сталінскай дружбе народаў СССР, аб шчаслівым і радасным жыцці туркменскага народа.

10 спецыяльных вучылішчаў і школ рыхтуюць кадры работнікаў мастацтва.

Замест двух бібліятэк і аднаго кінатэатра да рэвалюцыі, у Туркменіі ёсць 544 бібліятэкі, 670 клубаў, 254 кіноўстаноўкі, у тым ліку 145 гукавых.

Пры цары на туркменскай мове не выдавалася ні кніг, ні газет. Зараз у рэспубліцы выдаюцца на туркменскай мове 6 журналаў, 4 рэспубліканскія газеты, звыш 40 раённых газет. У 1937-38 г. на туркменскай мове выдана 378 кніг з тыражом 4,5 мільёна экземпляраў. У 1939 годзе на туркменскую мову перакладзены «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і «Пытанні ленінізма» І. В. Сталіна.

Разграміўшы пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі змяёныя гнёзды ворагаў народа — трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, туркменскі народ вылучыў на кіруючую работу сваіх лепшых сыноў і дачок. Толькі ў 1939 г. на кіруючую партыйную, совецкую і гаспадарчую работу вылучана ў рэспубліцы звыш 1000 чалавек.

Росквіт творчых сіл туркменскага народа, яго самаадданая работа на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, яго гатоўнасць сакрушыць ворага, калі ён пасмее нарушыць свяшчэнныя рубяжы нашай вялікай радзімы, яркa сведчаць аб таржастве соцыялізма ў нашай краіне, аб перамозе ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

У адказ на заклік главы Совецкага ўрада таварыша Молатава — чэсная і самаадданая працай дапамагчы нашай Чырвонай Арміі, вызваляючай адзінакроўныя народы—братоў-украінцаў і братоў-беларусоў ад іга польскіх паноў—з новай сілай разгарнулася ў Туркменіі соцыялістычнае спаборніцтва.

***

Туркменскі народ за 15 год з дня ўтварэння рэспублікі прайшоў велічны шлях. Яшчэ больш грандыёзныя перспектывы адкрывае перад ім вялікі план трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Туркменскі народ, яшчэ цясней згуртаваўшы свае рады вакол пабеданоснага сцяга большэвіцкай партыі, правадыра працоўных усяго свету вялікага Сталіна, яшчэ сільней умацаваўшы брацкую дружбу народаў СССР, дабіваецца новых поспехаў на шляху да комунізма.

ЗА РУБЯЖОМ

РАЗГУЛ АНТЫСОВЕЦКАЙ КАМПАНІІ Ў ФІНЛЯНДЫІ

ХЕЛЬСІНКІ, 22 лістапада. (ТАСС). Папаўшы пасля разрыву перагавораў з Масквой у безнадзейны тупік, фінляндскія правячыя кругі не спыняюць сваёй падазронай палітычнай ігры. За апошнія дні тут пускаюцца розныя «пробныя» шары для таго, каб стварыць уражанне аб «моцнасці» пазіцыі і знайсці новы спосаб выбрацца з цяжкага становішча. Напрыклад, афіцыяльныя кругі часта заяўляюць, што савецкія прапановы нібы «ўзмоцнена вывучаюцца», што «выхад павінен быць знойдзен» і т. д. Не далей, як пазаўчора, у гэтым духу выступіў перад журналістамі прадстаўнік міністэрства замежных спраў. Ён гаварыў аб тым, што «Фінляндыя спакойна чакае развіцця падзей і жадае, каб пытанне аб узаемаадносінах з СССР праяснілася». Характэрна, што на дыпламатычнай сцэне цяпер дзейнічаюць не дзяржаўныя дзеячы, а дробныя чыноўнікі. Рэжысура астаецца ў цені. Яна хавае ад шырокай грамадскасці свае сапраўдныя намеры — упорнае супраціўленне мірным прапановам Савецкага Саюза, нежаданне пайсці на пагадненне з ім.

Для захавання свайго падмочанага аўтарытэта ўрадавыя кругі распусцілі чуткі аб тым, што Паасіківі—фінляндскі ўпаўнаважаны пры перагаворах у Маскве — вёў няправільную лінію, што трэба таму чакаць яго адстаўкі. Але гэта адстаўка, па раз'ясненню некаторых газет, адбудзецца толькі праз некалькі месяцаў. Гэта ён, Паасіківі, вінават у няўдачы савецка-фінляндскіх перагавораў, ён носьбіт зла, а ўрад «шчыра імкнецца наладзіць адносіны з СССР» — у такім духу прабуюць цяпер паказаць стварыўшаеся становішча.

Вялікую цікавасць прадстаўляе і той факт, што афіцыяльна абвяргаюцца паведамленні газет аб магчымым пасяджэнні сейма ў бліжэйшы час у сувязі з савецкімі прапановамі. Калі адбудзецца гэтае пасяджэнне — міністэрству замежных спраў «пакуль невядома».

Такім чынам, цалкам пацвярджаецца, што ўрад не рашаецца выступаць публічна ў сейме, хоць для гэтага вядзецца самая інтэнсіўная падрыхтоўка. Зразумела, ад паслухмянага сейма нельга чакаць якіх-небудзь асаблівых рашэнняў, але ўсё-ж працяглая апрацоўка дэпутатаў па фракцыях прадаўжаецца, і яна вельмі паказальна.

Нарэшце, трэба адзначыць няўдалае лавіраванне сацыял-дэмакратычных лідэраў. Пасля таго, як яны пастараліся зрабіць усё для зрыву пагаднення з СССР, з іх лагера сталі раздавацца асцярожныя галасы аб тым, што не пашкодзіла-б скарыстаць «усе магчымасці для прадаўжэння перагавораў». Гэта, у прыватнасці, знайшло сваё адлюстраванне ў артыкуле старшыні парламенцкай камісіі па замежных справах Свенто, апублікаваным у «Суомен сосіалідэмокраці». Свенто «вельмі засумаваны, шкадуе, што няма пагаднення з СССР».

Сапраўды, Свенто праліває кракадзілавы слёзы, міжвольна выкрываючы антысавецкі курс рэакцыйных лідэраў сацыялдэмакратыі.

Адным словам, няма сумненняў, што кіруючыя кругі Фінляндыі канчаткова заблыталіся ў сваёй ігры. Ім не ўдасца ўвесці ў заблуджэнне фінскі народ і сусветную грамадскую думку, не гледзячы на бесперапынную прапаганду аб «непрыемлемасці» савецкіх прапаноў і ўсякіх мнімых «пагрозах» з боку СССР. Варожая антысавецкая лінія правячых кругоў Фінляндыі выкрыта.

Фінляндскі друк да гэтага часу не аслабляе рэзка варожай кампаніі супроць СССР. З аднаго боку, робяцца заявы аб неабходнасці пагаднення з СССР, а з другога боку, вядзецца самая раз'юшаная антысавецкая прапаганда. Усё новымі і новымі фактамі правячыя кругі Фінляндыі даказваюць сваю крайнюю варожасць да Савецкага Саюза.

АРЫШТ ВІНОЎНІКА НА ЗАМАХ У МЮНХЕНЕ

БЕРЛІН, 22 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае паведамленне начальніка ахоўных атрадаў і паліцыі, у якім гаворыцца, што адразу-ж пасля замаху ў Мюнхене 8 лістапада былі прыняты меры да раскрыцця злачынства і затрымання злачынца. Былі неадкладна закрыты ўсе германскія граніцы і ўзмоцнен пагранічны кантроль. Сярод арыштаваных у тую-ж ноч знаходзіўся нейкі Георг Эльзер, які прабаваў нелегальным чынам перайсці германскую граніцу, каб папасці ў Швейцарыю. 14 лістапада Эльзер пасля першапачатковага ўпорнага запірацельства даў падрабязныя паказанні. Ён заявіў, што рыхтаваў з дня ў дзень замах. У адну з калон зала, дзе праходзіла пасяджэнне, ён заклаў адскую машыну, узрыў якой павінен быў адбыцца па разліку праз 6 дзён, або праз 144 гадзіны. Замах быў намечан яшчэ ў верасні і кастрычніку 1938 года. У жніўні 1939 года ў калоне была зроблена камера, якая прызначалася для ўзрыўчатых вяшчэстваў. Зараз з узрыўчатымі вяшчэствамі быў прынесен у зал за 7 дзён да пасяджэння. Затым Эльзеру ўдалося закласці адскую машыну ў зробленую загадзя ў калоне камеру.

Яму ўдалося ў ноч з 7 на 8-е пранікнуць зноў у зал, дзе быў потым зроблен узрыў, каб яшчэ раз асабіста пераканацца ў рабоце гадзіннікавага механізма адскай машыны.

«Маральным віноўнікам, які дастаўляў матэрыяльныя сродкі для арганізацыі злачынства, гаворыцца ў паведамленні, была англійская «Інтэліджэнс сервіс». Арганізатарам злачынства з'яўляецца Ота Штрасер. Рэзультаты пошукаў гэтых маральных віноўнікаў і саўдзельнікаў яшчэ не могуць быць апублікаваны. Ва ўсякім разе, частка звязаных са злачынствам асоб ужо арыштавана».

**

БЕРЛІН, 22 лістапада. (ТАСС). Газеты апублікавалі паведамленне германскага інфармацыйнага бюро аб арышце пры спробе пераходу праз галандска-германскую граніцу двух англічан—Беста і капітана Стэвенса. Паводле сцвярджэння агенцтва, Бест з'яўляўся кіраўніком створанага ў Гааге «Цэнтра англійскай тайнай паліцыі («Інтэліджэнс сервіс») па рабоце ў Заходняй Еўропе», які прабаваў арганізаваць у Германіі антыўрадавую змову.

**

ЛОНДАН, 22 лістапада. (ТАСС). У сувязі з паведамленнем германскіх газет аб арышце віноўніка ўзрыву ў Мюнхене Эльзера і англічан капітана Стэвенса і Беста агенцтва Рэйтэр апублікавала заяву англійскага міністэрства замежных спраў. У ёй указваецца, што англійскія афіцыяльныя кругі разглядаюць паведамленне германскіх газет як нешта «зусім немагчымае». Англійскае міністэрства замежных спраў указвае, што два англійскія падданыя былі захвачаны на германа-галандскай граніцы і што паміж гэтым захватам і арыштам Эльзера няма ніякай сувязі. Ні англійскаму ўраду, гаворыцца ў заяве міністэрства, ні якому-небудзь яго прадстаўніку нічога невядома аб арыштаваным германскім грамадзяніне Эльзеры.

Капенгагенскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на паведамленне берлінскага карэспандэнта датскай газеты «Палітыкен», паведамляе, што Бест і Стэвенс заявілі германскім уладам пратэст супроць іх арышту. Яны ўказалі, што былі захвачаны на галандскай тэрыторыі.

Заява прэм'ер-міністра Японіі Абэ

ТОКІО, 22 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Домей цусін паведамляе, што 21 лістапада прэм'ер-міністр Японіі Абэ зрабіў для друку паведамленне па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі ўрада.

Закранаючы адносіны з Савецкім Саюзам, Абэ заявіў, што японскі ўрад у сучасны момант прымае меры да таго, каб шляхам вырашэння спрэчных пытанняў паміж Японіяй і Савецкім Саюзам устанавіліся мірныя адносіны. Указаўшы на арганізацыю змешанай пагранічнай камісіі для ўдакладнення граніцы паміж Манчжоу-Го і Знешняй Манголіяй, Абэ заявіў, што ўрад Японіі імкнецца таксама да дружаственага ўрэгуліравання рыбалоўнага пытання, а таксама пытання аб японскіх вугальных і нафтавых канцэсіях на Паўночным Сахаліне.

У пачатку еўрапейскай вайны, прадаўжаў Абэ, урад абвясціў палітыку неўмяшання ў гэту вайну. У дадзены момант Японія захоўвае свабоду дзеянняў і ўважліва сочыць за развіццём абстаноўкі не будучы звязана палітыкай умацавання антыкомінтэрнаўскага пакта.

Абэ заявіў, што шлях да вырашэння кітайскага пытання быў сфармуліраван у заяве Каноэ. Зараз праводзяцца падрыхтоўчыя мерапрыемствы для ўстанаўлення новага ўрада Кітая на чале з Ван Цзін-веем. Японскі прэм'ер асабліва падкрэсліў важнасць Паўночнага Кітая для Японіі і выразіў надзею, што паміж Японіяй і Паўночным Кітаем, а таксама Унутранай Манголіяй установяцца «асобыя адносіны».

Закранаючы розныя погляды на вырашэнне кітайскага пытання, Абэ перасцярог ад аптымізма. Японія зрасходавала звыш 10 млрд. іен на вайну ў Кітаі, і гэтыя расходы павінны несці не толькі цяперашняе, але і наступныя пакаленні. Таму прэм'ер заклікаў народ «умацаваць сваю рашымасць для ўрэгуліравання кітайскага пытання, не чакаючы лёгкага вырашэння яго ў сучасных умовах».

ВАЙНА Ў ЕЎРОПЕ

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

БРУСЕЛЬ, 23 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню з Амстэрдама, 21 лістапада над галандскай ваенна-марской базай Гельдэр ляталі замежныя самалёты.

**

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора англійская і французская авіяцыі збілі на заходнім фронце 6 германскіх самалётаў. Адзін з іх упаў у Бельгіі.

У англійскай авіяцыі страт няма. Французская авіяцыя страціла 2 самалёты. Лётчыкі, якія знаходзіліся на гэтых самалётах, выкінуліся на парашутах, прычым адзін парашут не раскрыўся, і пілот загінуў.

**

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі паведамляе, што 20 і 21 лістапада англійскія самалёты зрабілі палёт над Франкфуртам, Штутгартам, Гамбургам і Брэменам.

**

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). Як паведамляюць англійскія газеты, учора шэсць германскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Шатландскія астравы (група астравоў, размешчаных на паўночны ўсход ад Вялікабрытаніі, у 180 кіламетрах ад паўночнай аканечнасці Шатландыі). Адна са скінутых бомб папала ў стаяўшы на якары гідраплан, які згарэў. Каманда гідраплана выратавалася. Самалёты прабавалі бамбардыраваць курсіруючы паміж астравамі паштовы параход.

Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, учора ў раёне паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі былі заўважаны германскія самалёты. Адзін з іх збіт агнём англійскай зенітнай артылерыі.

ЗВОДКА НАРКАМЗЕМА БССР

АБ ХОДЗЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ І ЎВЯДЗЕННІ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВААБАРОТАЎ ПА РАЁНАХ І АБЛАСЦЯХ РЭСПУБЛІКІ на 20 лістапада 1939 г.

(у процантах да плана)

Вобласці і раёны	Абмалочана азімых і яравых каласавых	Паднята зябліва	Уведзена севаабаротаў
Віцебская вобласць	88.5	51.7	41.1
Раёны:			
Аршанскі	81.1	70.7	64.1
Асвейскі	100.0	50.0	44.7
Багушэўскі	78.5	55.7	86 6
Бешанковіцкі	85.7	50.1	27.8
Ветрынскі	80.8	38.5	28.3
Віцебскі	89.4	59.7	31.2
Гарадоцкі	96.5	44 3	48.0
Дрысенскі	97.0	60.7	48.7
Дубровенскі	90.7	46.1	51.3
Лепельскі	100.0	46.3	56.6
Лёзнянскі	76.2	42.1	33.3
Мехаўскі	95.0	37.3	20.0
Полацкі	84.5	53.6	21.4
Расонскі	82.7	34.3	20.8
Сенненскі	75.2	52.2	28.5
Сіроцінскі	91.7	48.2	4.1
Суражскі	88.3	46.4	58.3
Талачынскі	88.1	69.6	36.1
Ушацкі	94.9	49.1	71 0
Чашніцкі	87.6	62.5	100.0
Гомельская вобласць	89.9	70.5	50.3
Раёны:			
Будакашалеўскі	84.8	61.1	35.6
Веткаўскі	94.1	91 8	52.0
Гомельскі	98.6	77.4	54.5
Добрушскі	99.4	69.2	88.9
Жлобінскі	84 8	69.4	55.0
Журавіцкі	90.7	74.1	75 0
Кармянскі	87.6	60.6	51.8
Лоеўскі	100.0	77.8	57.9
Рагачоўскі	82.7	59.8	36.0
Рэчыцкі	96.0	71.7	61.5
Свяцілавіцкі	96.0	75.7	55.5
Уваравіцкі	89.1	55.1	50.0
Перахоўскі	97.0	74.8	57.1
Чачэрскі	89.5	82.9	50 0
Стрэшынскі	89.2	76.0	33.3
Магілеўская вобласць	84.0	58.2	62.5
Раёны:			
Асіпавіцкі	82.3	85.4	86.1
Бабруйскі	77.8	76.7	96.5
Бялыніцкі	99.8	51.7	46.1
Бярэзінскі	83.4	71.6	73.9
Быхаўскі	86.5	41.7	40.7
Горацкі	97.2	63.1	56 9
Дрыбінскі	73.9	52.7	94.2
Касцюковіцкі	86.0	64.2	87.7
Кіраўскі	83.5	67.9	62.5
Клімавіцкі	88.5	65 0	34.8
Клічаўскі	82.7	61.7	40.0
Круглянскі	89.6	55.1	51.4
Крычаўскі	74.5	69.4	85.7
Магілеўскі	91.5	58.3	44 6
Мсціслаўскі	69.1	43.2	60.0
Прапойскі	92.6	58.7	52.6
Хоцімскі	93.4	61.3	68.4
Чавускі	73.9	35.7	40.4
Чэрыкаўскі	76.6	48.9	57.4
Чырвонапольскі	77.6	66.4	46.6
Шклоўскі	83.1	51.3	61.3
Мінская вобласць	81.6	79.7	65.9
Раёны:			
Барысаўскі	95.3	80.9	100.0
Бягомльскі	97.5	77.0	44.6
Грэскі	80.7	102.2	115.3
Заслаўскі	66.7	82.3	32.6
Капыльскі	64.8	94.0	100.0
Крупскі	87.3	76.5	47.5
Лагойскі	82.6	77.6	41.9
Любанскі	74.8	62.7	77.9
Мінскі	59 9	61.4	41.9
Плешчаніцкі	88.9	60.0	39.4
Пухавіцкі	100.0	96.9	100.0
Слуцкі	78.0	81.3	84.0
Смалявіцкі	92.4	83.5	60.6
Рудзенскі	70.0	85.1	78.5
Старадарожскі	92.0	90.1	105.0
Старобінскі	77.1	100.0	28.9
Уздзенскі	81.7	105.0	85.7
Халопеніцкі	79.4	46.0	33.3
Чэрвеньскі	89.4	74.0	60.0
Чырвонаслабодскі	73.2	105 2	100.0
Дзяржынскі	89.8	80.8	72.5
Палеская вобласць	88.1	76.0	44.9
Раёны:			
Брагінскі	85.1	95.9	94.7
Васілевіцкі	90.8	61.4	10 0
Глускі	85.6	57.7	38.9
Дамапавіцкі	80.3	42.3	46.1
Ельскі	83.5	79.6	52.4
Жыткавіцкі	97.3	84 0	24.4
Камарынскі	92.7	98.6	80.0
Капаткевіцкі	82.6	74.8	40.7
Лельчыцкі	100.0	91.5	26.3
Мазырскі	85.9	73.5	95 0
Нараўлянскі	91.0	80.4	13.3
Парыцкі	89.6	69.8	52.4
Петрыкаўскі	79.1	91.6	41.6
Тураўскі	97.5	103 9	31.2
Хойніцкі	91.9	82.9	66.6
Калінкавіцкі	92.7	70.5	27.4
Акцябрскі	81.8	74.0	—
Усяго па БССР	85.7	64.2	54.8
Было на 15/XI-39 г.	84.5	60.7	51.4

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ І АДДЗЕЛ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННЯ НКЗБ.

АРГАНІЗАВАЦЬ АГРАТЭХВУЧОБУ КАЛГАСНІКАЎ

КЛІМАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Барацьба за атрыманне высокіх ураджаяў немагчыма без сур'ёзнага авалодання шырокімі масамі калгаснікаў перадавой агратэхнікай. Толькі там, дзе калгаснікі авалодалі і прымянялі на практыцы перадавую агратэхніку, дасягнуты добрыя вынікі ў павышэнні ўраджайнасці калгасных палёў.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Энергія», Гусарскага сельсовета, атрымалі сёлета з кожнага гектара ўсёй пасеўнай плошчы па 13 цэнтнераў жыта і па 22 цэнтнеры ячменю. Сярэдняя ўраджайнасць у калгасе ўсіх зернавых культур з кожнага гектара складае 15 цэнтнераў.

Выдатны ўраджай ільноваалакна атрымалі таксама ільнаводы калгаса «Улада Саветаў», Студзянецкага сельсовета. Тут з кожнага гектара пасеву знялі па 5 цэнтнераў ільноваалакна. Калгас не толькі выканаў, але і значна перавыканаў план здачы ільнопрадукцыі дзяржаве.

Калгаснікі заваявалі высокія ўраджаі, дзякуючы шырокаму прымяненню ўсяго комплекса агратэхнікі: па апрацоўцы глебы, сяўбе, доглядзе за пасевамі і ўборцы ўраджаю.

У мінулым годзе ў некаторых калгасах раёна, як, напрыклад, «3-ці Інтэрнацыянал», Асмолаўскага сельсовета, прававодзілі агратэхнічныя гурткі. Калгаснікі актыўна наведвалі заняткі, старанна вывучалі агратэхніку.

Цяпер, калі ў асноўным закончаны сельскагаспадарчыя работы, самы спрыяючы час для арганізацыі агратэхнічнай вучобы.

Сёлета ў калгасах раёна ёсць 213 звенняў. У звяне фактычна рашаецца лёс высокага ўраджаю. Цяпер многія звенні рыхтуюцца да вясны: збіраюць попел і іншыя мясцовыя ўгнаенні. Яны адчуваюць вялікую неабходнасць у набыцці агратэхнічных ведаў. На жаль, ім у гэтым не аказваюць неабходнай дапамогі аграномы райземаддзела і МТС. Між тым, у раёне ёсць дастаткова агранамічных сіл, якія абавязаны ўзначаліць агратэхнічную вучобу калгаснікаў. У раённым зямельным аддзеле (загадчык тав. Бісоўка) яўна імкнуцца адкласці гэтую справу на больш позні час. Старшы аграном райземаддзела тав. Шатый заяўляе: «Мы зімой будзем займацца агратэхвучобай».

Кіраўнікоў Клімавіцкага райземаддзела, відаць, яшчэ не навучыў горкі вопыт мінулага года, калі агратэхвучобай пачалі займацца фактычна толькі вясной. Несістэматычная, наспех арганізаваная вучоба, безумоўна, не магла даць і не дала жаданых вынікаў.

Калгаснікі, змагаючыся за высокія ўраджаі будучага года, хочуць авалодаць перадавой агратэхнікай сацыялістычнага земляробства. Ім у гэтым павінна быць аказана ўсямерная дапамога.

С. КАЗНАЧЭЕЎ.

ПАМЯЦІ С. М. КІРАВА

1 снежня спаўняецца 5 год з дня злачынскага забойства кіраўніка ленінградскіх бальшавікоў, любімца савецкага народа С. М. Кірава. Працоўныя сталіцы БССР, як і ўсяго Савецкага Саюза, свята ўшаноўваюць памяць аб дарагім і незабыўным Сергею Міронавічу. Напярэдадні жалобнай гадавіны на прадпрыемствах, ва ўстановах, школах будуць наладжаны даклады і гутаркі, прысвечаныя палкаму трыбуну рэвалюцыі. У Доме партактыва адбудзецца сход партыйнага актыва горада, на якім будзе пастаўлен даклад аб жыццёвым шляху С. М. Кірава. У Доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава наладжваецца вечар для байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Мінскага гарнізона.

У бібліятэках Дома Чырвонай Арміі і Дома партыйнага актыва адкрыты выстаўкі літаратуры і фотаматэрыялаў на тэму «5 год з дня смерці С. М. Кірава».

—о—

ВЕЧАР У ЧЭСЦЬ ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЙ АКАДЭМІІ імені В. І. ЛЕНІНА

У мінскім Доме Чырвонай Арміі адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 20-годдзю Ваенна-палітычнай акадэміі імені В. І. Леніна. З дакладам аб слаўным юбілеі кузніцы сталінскіх камісараў выступіў прадстаўнік акадэміі, палкавы камісар тав. Карабейнікаў.

У сваіх выступленнях палітработнікі, былыя слухачы акадэміі, расказалі аб сваёй рабоце па аўладанню бяссмертным вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, па выхаванню бальшавіцкіх кадраў.

Удзельнікі вечара паслалі прывітальныя тэлеграмы акадэміі, тав. Варашылаву і тав. Мехлісу.

—о—

МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІ ІНСТЫТУТ „ВЫХАДНОГА ДНЯ"

Згодна рашэння бюро Мінскага абкома КП(б)Б пры Доме партыйнага актыва ў Мінску арганізуецца марксісцка-ленінскі інстытут «Выхаднога дня». Інстытут разлічан на 400—500 чалавек партыйнага і камсамольскага актыва сталіцы БССР, а таксама бліжэйшых раёнаў вобласці. Слухачамі яго будуць залічаны таварышы, якія маюць асвету за 7 класаў.

У праграме інстытута — тэарэтычныя і навуковыя лекцыі, агульна-адукацыйныя прадметы. Тэрмін навучання — 1 год. Для выкладання тут будуць прыцягнуты лепшыя прафесары Мінска і Масквы.

Зараз вядзецца падрыхтоўка да адкрыцця інстытута. Заняткі пачнуцца з 1 студзеня 1940 года.

—о—

Творчы вечар ансамбля пагранічнай песні і пляскі

Учора ў клубе НКВД БССР адбыўся вялікі творчы вечар ансамбля песні і пляскі пагранічных войск Беларускай акругі. Ансамбль нядаўна вярнуўся з заходніх абласцей БССР, дзе даў 57 канцэртаў для пагранічнікаў, байцоў Чырвонай Арміі і мясцовага насельніцтва. Усе яго выступленні прайшлі з велізарным поспехам. Цяпер ён узмоцнена рыхтуецца да надыходзячага ў Маскве агляду пагранічных ансамбляў.

На творчым вечары быў выканан літаратурна-музыкальны мантаж «Заходняя граніца» — аб героях-пагранічніках БССР і іх выдатных патрыятычных справах. У праграме былі таксама народныя песні і пляскі, мастацкае чытанне і т. д.

—о—

Электрычнасць у кватэрах рабочых

БАРАНАВІЧЫ. За апошні месяц у горадзе значна павялічылася колькасць абанентаў электрастанцыі. Электрычная лямпачка асвятліла кватэры працоўных у рабочых кварталах. Праведзена электрычнасць у 535 кватэрах працоўных Колпеніцкай, Вейскай і іншых акраінных вуліц.

Распачата праводка новай электралініі, што дасць магчымасць асвятліць усе акраіны горада. (БЕЛТА).

ШАХМАТЫ

ЗАДАЧА № 11

(конкурсная, 2 ачкі)



Белыя: Крf1, Лa8, Сh3, п. g2 (4)
Чорныя: Крh1, Сg3, Кg6, п.h2 (4)

У колькі хадоў белыя даюць мат чорным (ход белых)?

Прыведзеная задача — сёмае заданне конкурса рашэнняў. Трэба знайсці найменшую колькасць ходаў, патрэбных для матавання і прывесці варыянты, няўхільна вядучыя да мата.

Апошні тэрмін адсылкі рашэнняў — 5 снежня.

У СПАРТЫЎНЫХ ТАВАРЫСТВАХ І ПРОФСАЮЗАХ

У сувязі з аб'яднаннем фізкультурнікаў і шахматыстаў саюза работнікаў дзяржустаноў у спартыўным таварыстве «Бальшавік», цікава адзначыць вынікі работы шахсекцыі ЦП саюза. Шахматна-шашачныя секцыі арганізаваны ў 9 калектывах гор. Мінска (буйнейшая — у інстытуце народнай гаспадаркі — 114 чалавек), у Гомелі, Мазыры, Магілеве. У спаборніцтвах за год прыняла ўдзел 281 чалавек, з якіх 170 атрымалі шахматна-шашачную кваліфікацыю. Выступленні шахматыстаў і шашыстаў у спаборніцтвах ЦК саюза (Сіліч, Брэйтман, Заблоцкі, Маслянскі, Дыскіна) паказалі высокі ўзровень тэхнікі прадстаўнікоў БССР. Так, тав. Сіліч (Віцебск) заваяваў званне чэмпіёна ЦК саюза па шахматах у 1938 годзе, а ў 1939 годзе тав. Сіліч атрымлівае пачэснае званне майстра СССР. Каманда саюза заняла другое месца па гор. Мінску ў спаборніцтве 1938—1939 года.

Спартыўнае таварыства «Бальшавік» атрымлівае моцны спартыўны калектыў на чале з майстрам Сілічам і добры грамадскі актыў (тт. Мохарт, Гаральскі, Дыскіна, Кавалёў, Рыўкінд).

**

Па саюзу медсанпрацы за апошні год у спаборніцтвах прыняла ўдзел амаль 600 шахматыстаў і шашыстаў БССР. 234 чалавекі атрымалі ўсесаюзную шахматна-шашачную кваліфікацыю. Праведзены рэспубліканскія спаборніцтвы, як вынік масавых турніраў Мінска, Віцебска, Гомеля, Мазыра, Бабруйска. Праведзен турнір членаў сямей, з удзелам 19 чалавек. У канцы 1938 года арганізавана цікавая сустрэча абмену вопытам вытворчай і шахматна-шашачнай работы з ЦК саюза Грузінскай ССР у Мінску, а зараз каманда ЦК медсанпрацы БССР знаходзіцца ў гор. Тбілісі з той-жа мэтай.

Сярод шахматыстаў і шашыстаў многа высокакваліфікаваных: Кабакоў (Віцебск — шашкі) — мае першую ўсесаюзную катэгорыю, Гендэль (Мінск) — другую. Сярод шахматыстаў урачы Гурвіч і Габрыловіч, студэнты Камісарук, Алесін, Хасін маюць другую ўсесаюзную катэгорыю.

АБЛАСНАЯ НАРАДА АБАРОННАГА АКТЫВА

МАГІЛЕЎ. (Спец. кар. «Звязды»). У Доме піянераў адкрылася абласная нарада абароннага актыва, скліканая абкомам партыі. Прысутнічаюць 148 чалавек — загадчыкі ваеннымі аддзеламі гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, старшыні райсоветаў і пярвічных арганізацый Асоавіяхіма прадпрыемстваў, калгасаў і навучальных устаноў. У парадку дня пытанні — аб становішчы масава-абароннай работы ў вобласці і аб падрыхтоўцы да прызыва ў РСЧА ў 1940 г.

Дзеннік

25 лістапада, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва Мінгаркома КП(б)Б склікае курсы для не праходзіўшых іх старшынь, нам. старшынь, сакратароў і членаў акруговых выбарчых камісій па выбарах у гарсовет.

26 лістапада, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва адбудзецца інструкцыйны даклад для агітатараў і прапагандыстаў на тэму «Палкі трыбун рэвалюцыі» (да пятай гадавіны злачынскага забойства тав. Кірава). Дакладчык тав. Радзецкі.

Аддзел прапаганды і агітацыі Мінгаркома КП(б)Б.

В. а. адказнага рэдактара Т. С. ГАРБУНОЎ.

25 лістапада ў 18 гадзін, у г. Мінску у памяшканні Дома настаўніка (Комуністычная, 19)

СКЛІКАЕЦЦА

2-гі з'езд профсаюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы БССР

ПАВЕСТКА ДНЯ:

1. Справаздача Цэнтральнага камітэта саюза і рэвізійнай камісіі.
2. Выбары Цэнтральнага камітэта і рэвізійнай камісіі.
3. Выбары дэлегатаў на X з'езд профсаюзаў СССР.

Рэгістрацыя дэлегатаў праводзіцца 24 лістапада з 10 гадзін раніцы да 24 гадзін і 25 лістапада з 8 гадзін раніцы да 24 гадзін ў памяшканні Дома настаўніка.

ПРЭЗІДЫУМ ЦК САЮЗА.

ВЯЛІКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР
24 лістапада
ВАХЧЫСАРАЙСКІ ФАНТАН
Абанемент № 180. Пачатак у 8 г. веч.
Білеты ў тэатральнай касе Дома саюзаў з 12 да 5 г., у дзень пастаноўкі — у касе тэатра з 6 г. веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
24 лістапада
Абанемент № 56.
АПОШНІЯ
Пачатак у 7 г. 30 м. веч. Каса з 2 да 8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
24 лістапада
Абанемент № 28.
ГЕРШЭЛЕ ОСТРАПОЛЕР
Пачатак у 8 гадзін вечара.
Каса з 12 да 2 і з 4 да 8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР
(памяшканне клуба імені Сталіна)
Дэкада савецкай музыкі
24 лістапада
Абанемент № 45.
сімфанічны КАНЦЭРТ
Дырыжор К. А. СІМЕОНАЎ.
У КАНЦЭРЦЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ: ХОР ДЗЯРЖАЎНАЙ ФІЛАРМОНІІ БССР, мастацкі кіраўнік І. Г. БАРЫ. Заслужаная артыстка БССР Р. В. МЛОДЭК.
Лектар В. Я. ТРАЙНІН.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты ў касе клуба з 3 да 9 гадзін вечара.

Кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
«ВЫСОКАЯ НАГРАДА»

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
«ТРОЕ С ОДНОЙ УЛИЦЫ»

Кінотэатр «РОДИНА»
«ДОКТОР КАЛЮЖНЫЙ»

Кінотэатр «Спартак»
ДЗЕЦІ КАПІТАНА ГРАНТА

Дзіцячы кінотэатр
РУСЛАН І ЛЮДМІЛА

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. «22-й ОКТЯБРЬ» (парад на Чырвонай плошчы).
2. «ВОРОШИЛОВСКИЕ ВСАДНИКИ» (кінонарыс).

МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ

ЁЛКА —
ЛЕПШЫ НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК ДЗЕЦЯМ!
ЗАБЯСПЕЧЦЕ ЗАГАДЗЯ ВАШЫМ ДЗЕЦЯМ НАВАГОДНЮЮ ЁЛКУ.

У МАГАЗІНАХ МІНГОРПРАМГАНДЛЯ
вы можаце купіць разнастайны асартымент
ёлачных упрыгожанняў і падарункаў паштучна і камплектамі
У ПРОДАЖЫ ЁСЦЬ:

вялікі выбар розных ЦАЦАК з картона ў выглядзе РЫБАК, ЗАЙЧЫКАЎ, ШПАКОЎНІЦ, ДОМІКАЎ і т. д.
Розныя шкляныя ўпрыгожанні, афарбаваныя ў розныя колеры: ЗВЁЗДАЧКІ,
БУСЫ, ШАРЫ, АРЭХІ, ВІНАГРАД, ШЫШКІ і т. д.
Розных размераў ДЗЕДЫ МАРОЗЫ, МІШУРА, БЕНГАЛЬСКІЯ АГНІ, ШТУЧНЫ СНЕГ, СЕРПАНТЫН, КАНФЕЦІ і т. д.

ШКОЛЫ, КЛУБЫ, ДЗІЦЯЧЫЯ САДЫ, ФАБЗАЎМЯСЦКОМЫ, КАЛГАСЫ, ПІОНЕРСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ І БАЦЬКІ!

УСЁ ГЭТА ВЫ МОЖАЦЕ КУПІЦЬ У НІЖЭЙПЕРАЛІЧАНЫХ МАГАЗІНАХ:

Дзіцячы Універмаг № 1 — Ленінская, 1/9
Універмаг № 17 — Ленінская, 17
Магазін № 3 — Ленінская, 9/2
Магазін № 55 — Савецкая, 63
Магазін № 42 — Савецкая, 69
Магазін № 58 — Васточная, 33
Магазін № 2 — Грушаўскі пасёлак
Магазін № 32 — Суражская, 2
Магазін № 63 — Камароўскі рынак
Магазін № 16 — Віленскі рынак.

МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Савецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказнага рэдактара — 21-352; Адказнага сакратара — 25-188; Літаратурнага сакратарыята — 22-412; Сакратарыята — 21-846; АДДЗЕЛАЎ: Партыйнага — 21-353; Савецкага будаўніцтва, гандлю і прамысловага — 21-356, Сельскагаспадарчага — 20-830; Літаратуры і мастацтва — 23-055; Прапаганды і мясцовай інфармацыі — 25-188; Школ, навукі і ваеннага — 21-550; Пісем — 20-844, 21-399, 21-885; Загадчык выдавецтва—21-358, Аб'яў—21-845; выпускаючага—24-768.

Уп. Галоўлітбела № Г—1534. Мінск, друкарня «Звязды», Савецкая, 49. М., М., Ш.